КОЛЬКІ НАПАЗЫЧАЛІ БЕЛАРУСЫ **3**

БЕЛАРУСКАЯ АДУКАЦЫЯ ВАЧЫМА ЗАМЕЖНІКАЎ **4**

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

7 ВЕРАСНЯ 2019 г. СУБОТА № 170 (29037)

Брэст 1000 год!

НА СКРЫЖАВАННІ ЧАСОЎ І НАРОДАЎ

1000-годдзе Брэста насамрэч стала святам дзяржаўнага маштабу

На ўрачыстае мерапрыемства, прысвечанае пачатку святкавання 1000-годдзя горада, людзі збіраліся на плошчы Леніна з самага ранку. Асаблівы настрой ствараліся святочныя дэкарацыі, музыка і лагоднае вераснёўскае сонейка. Горад доўга рыхтаваўся да знакавай даты, якая, несумненна, стала падзеяй дзяржаўнага маштабу. І шматлікія падарункі, якія Брэст атрымаў да 1000-годдзя, — сведчанне таго, што маштаб сапраўды дзяржаўны.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА падарыў гораду ўнікальны экзэмпляр Брэсцкай Біблii.

Падарунак сваімі рукамі

Адным з такіх самых важных і доўгачаканых падарункаў гораду і гараджанам стала адкрыццё Заходняга абходу Брэста. Аб'язная дарога пабудаваная за тры гады з выкарыстаннем унікальных тэхналогій. Яна падзяляе транспартныя плыні паміж левым і правым берагамі ракі Мухавец, пагранпераходы «Варшаўскі мост» і «Казловічы», забяспечвае аб'езд цэнтра горада вялікагрузным транспартам. Выкарыстанне пуцеправода грамадскім і асабістым транспартам жыхароў і гасцей Брэста пры перамяшчэнні з мікрараёнаў Рэчыца і Дуброўка ў цэнтр горада і назад дазволіць пазбегнуць заторaў у раёнах чыгуначных пераездаў.

Нездарма кіраўнік краіны свой візіт у Брэст, прымеркаваны да ўрачыстасцяў з нагоды юбілею, пачаў з агляду гэтага важнага аб'екта. Разам з кіраўнікамі вобласці, горада і генеральным падрадчыкам будаўніцтва Прэзідэнт перарэзаў сімвалічную чырвоную стужку, пасля чаго звярнуўся да будаўнікоў.

— Вы з гонарам выканалі маё даручэнне, — сказаў ён. — Рашэнне аб узвядзенні гэтага аб'екта было не проста правільнае і своечасовае — калі шчыра, мы прыпазніліся з будаўніцтвам гэтага аб'екта... Брэст з'яўляецца прыгранічным транзітным горадам, яго чыгуначны вузел — адно са звёнаў новага Шаўковага шляху.

Фота БелТА.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што аптымізацыя транспартных плыняў, стварэнне ў рэгіёне камфортных умоў для перамяшчэння пасажыраў і грузаў — пытанні стратэгічнага значэння.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што Заходні абход Брэста не толькі знізіць нагрузку на цэнтр горада, пазбавіць яго жыхароў і шматлікіх гасцей ад заторaў, але і стане важным аспектам у развіцці эканамічнага і турыстычнага патэнцыялу рэгіёна і краіны.

Ён адзначыў, што развязку спраектавалі і пабудавалі брэсцкія спецыялісты. «Рэалізацыя праекта стала паказальным прыкладам эфектыўнага выкарыстання часу і рэсурсаў, умення мясцовых уладаў працаваць з насельніцтвам, — сказаў Прэзідэнт. — Вельмі добра, што вы нікога не пакрыўдзілі. Вы стварылі інфраструктурны аб'ект самага высокага ўзроўню ў параўнальна сціслыя тэрміны, значна палепшылі жыццё брастаўчан. Не на словах, а на справе зрабілі свой унёсак у развіццё Беларусі — краіны для жыцця».

Найлепшы падарунак — той, які зроблены ўласнымі рукамі, заўважыў кіраўнік дзяржавы. Ён назваў новую развязку сапраўдным упрыгажэннем Брэста і найлепшым падарункам да яго тысячагадовага юбілею.

Горад, якім трэба ганарыцца

Выступаючы на ўрачыстым мерапрыемстве на галоўнай плошчы горада, Аляксандр Лукашэнка назваў тысячагадовы Брэст скрыжаваннем часоў і народаў, яго гісторыю набыткам усёй краіны, а яго сучаснае аблічча нагадай для гонару. «На фотаздымку, які зрабіў Алег Навіцкі з космасу, начны Брэст нагадвае вогненную птушку, — сказаў ганаровы госць мерапрыемства. — І гэты здымак сапраўды сімвалічны, ён нібы адлюстроўвае лёс горада, які не жадаў скарацца захопнікам і не раз быў спалены датла». Але ж, нібы міфічны Фенікс, Брэст адраджаўся з попелу і кожны раз рабіўся мацнейшы.

Выступоўца пералічыў многія заслугі горада і гараджан як піянераў добрых пачынанняў. Несумненна, іх варта памятаць і праз вякі. Менавіта Брэст на беларускай тэрыторыі першым атрымаў магдэбургскае права, тут узвялі першую на тэрыторыі сучаснай краіны друкарню, у якой была выдадзена Брэсцкая Біблія.

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр РАГАЧУК, старшыня Брэсцкага гарвыканкама:

«Удалося стварыць той падмурак, на якім будзе будавацца Брэст другога тысячагоддзя. Практычна ўсе інфраструктурныя пытанні, перш за ўсё транспартнага складніка, вырашаны. Застанецца толькі ўдасканальваць. Пераканалі людзей, што горад можа мяняцца на вачах — не як метафара, а рэальна. І на гэтым падмурку трэба будаваць далейшае жыццё горада, таму што з тысячагоддзем яно не заканчваецца. Заўсёды пасля юбілею пачынаецца проза жыцця. Дык вось трэба зрабіць так, каб гэтая проза не дысанавала з самім святам».

ISSN 1990 - 763X

50+: жыць цікава!

НА ПЕНСІІ — НЕ РАСКІСАЦЬ, А ВАЛАНЦЁРЫЦЬ

Гэта павысіць самаацэнку, палепшыць здароўе і верне сэнс жыцця

Усё больш беларусаў ва ўзросце пачынаюць прытрымлівацца добрай еўрапейскай традыцыі і становяцца валанцёрамі. Як, напрыклад, 64-гадовая Алена Еўдакімава з Зэльвы. Яна — яскравы прыклад таго, як можна жыць поўным жыццём ва ўзросце за 60. «Мы займаемся ёгай два разы на тыдзень у клубе «Даўгалецце праз рух», праводзім тэатральныя вечары, адзначаем разам усе дні нараджэння, ладзім канцэрты», — кажа яна. А яшчэ Алена Еўдакімава і яе сяброўкі сталі валанцёрамі.

— У кожнай з нас ёсць падапечныя інваліды і ветэраны. Ім шмат не трэба — дастаткова пагаварыць, схадзіць у краму ці ў аптэку па лекі. Нам гэта не цяжка, наадварот, прыносіць задавальненне, — апавядае жанчына. — Мы скідваемся кожны месяц па рублі і з гэтых грошай купляем падарункі да свят маленькім дзеткам, ад якіх адмовіліся бацькі, ці старэнькім бабулям-дзядулям, робім салодкія сталы. Калі сядзець на пенсіі дома, то неяк сумна жыць становіцца. Дзеці ў нас раз'ехаліся хто куды, толькі ўнукаў падкідваюць на канікулы... А нам хочацца рабіць нешта добрае. Вось я зараз поўная сіл, а хтосьці не можа хадзіць, некаму вельмі самотна і няма з кім пагаварыць. Нам хочацца палепшыць іх жыццё, і нас саміх гэта натхняе і надае нам сіл.

СТАР. 5

Захапленні

ТАМАТЫ ДЛЯ ДУШЫ

Як жыхарка Бешанковічаў вырасціла 600 сартоў памідораў

Як гэта ні дзіўна, але менавіта на поўначы Беларусі, у Бешанковіцкім раёне Віцебшчыны, жыве Надзея Куц, якая вырошчвае 600(!) сартоў памідораў. Чырвоныя, жоўтыя, ружовыя, фіялетавыя, чорныя, паласатыя і плямістыя... Сваю ўнікальную калекцыю яна не толькі год ад году пашырае, але і з задавальненнем дзеліцца насеннем, ведамі і вопытам па вырошчванні з такімі ж аматарамі гэтай культуры. Мы пабывалі на прысядзібным участку і даведаліся, чаго не любяць памідоры, дзе выводзяць экзатычныя сарты і чаму многія імі захапляюцца, а галоўнае — чаго вартая гэта праца.

СТАР. 14

НА СКРЫЖАВАННІ ЧАСОЎ І НАРОДАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У канцы XX стагоддзя тут была створана першая свабодная эканамічная зона, якая стала прыкладам партнёрскага ўзаемадзеяння бізнесу і дзяржавы. Не варта забываць, што Брэст і Брэстчына далі краіне і свету многіх славутых людзей. Адсюль родам першы беларускі касманаўт Пётр Клімук і алімпійская чэмпіёнка Юлія Несцярэнка.

Звяртаючыся да ўсіх брастаўчан, кіраўнік дзяржавы сказаў пра асаблівы гонар, які выпаў цяперашняму пакаленню. Вобразна кажучы, яны маюць магчымасць узяць за руку Брэст ды ўвесці яго ў новае тысячагоддзе. І з гэтай асаблівай місіяй гараджане выдатна спраўляюцца, бо абласны цэнтр выглядае прывабна і сучасна, за час падрыхтоўкі да юбілею ён перамяніўся і памаладзеў. Жыхары горада атрымалі пажаданне захаваць не толькі ўнікальную атмасферу Брэста, але таксама імкненне да прагрэсу, уменне працаваць на карысць радзімы і, галоўнае, перадаць гэтыя каштоўнасці дзецям, навучыць іх любіць малую радзіму, берагчы традыцыі на многія стагоддзі наперад.

А потым быў падарунак, пра які ў Брэсце многія гады толькі стрымана марылі. Кіраўнік дзяржавы паднёс у дар брастаўчанам арыгінальны экзэмпляр Брэсцкай Бібліі, надрукаваны тут у 1563 годзе. Такім чынам вечна жывая кніга амаль праз пяць стагоддзяў вярнулася дадому. Ну а ганаровы грамадзянін горада мастак-ювелір Мікалай Кузьміч ад усіх брастаўчан падарыў кіраўніку дзяржавы сваю аўтарскую работу «Брэсцкія васількі».

На пытанні журналістаў Прэзідэнт адказаў у Брэсцкай крэпасці. Візіт туды не значыўся ў плане рабочай паездкі кіраўніка дзяржавы, але не пакланіцца памяці гераічных абаронцаў славутай цытадэлі ён проста не мог.

Аб акумулятарным заводзе

«Я ў гэтым выпадку на баку людзей», — сказаў кіраўнік дзяржавы, адказваючы на пытанне журналістаў адносна будаўніцтва акумулятарнага завода пад Брэстам. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што, на жаль, парушэнні пры будаўніцтве гэтага завода былі выяўленыя і вінаватыя пакараныя ўжо пасля таго, як ён асабіста пачаў разбірацца ў сітуацыі.

«Доўгі час мы перапраўвяралі ўсю інфармацыю, якая да мяне трапіла, бо, ведаеце, знянацку махаць мячом або коп'і кідаць — гэта непрымальна. Калі я пераправерыў інфармацыю, то ўбачыў, што людзі тут у асноўным тыя, хто перажывае за экалогію, за сваё жыццё, за жыццё дзяцей, — яны маюць рацыю. І я ўбачыў там правапарушэнні і з боку дзяржаўных служачых асобных, і з боку асобных дзялкоў, якія паабяцалі пабудаваць патрэбны нам аб'ект», — расказаў Прэзідэнт.

Праект пабудовы акумулятарнага завода — добры, бо такіх заводаў у краіне няма, і яго трэба было рэалізоўваць, але так, каб у выніку не пацярпела экалогія, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён паведаміў, што некаторыя асобы, якія, магчыма, маюць дачыненне да парушэнняў пры будаўніцтве акумулятарнага завода, знаходзяцца ва ўцёках, але яны абавязкова будуць знойдзеныя і адкажуць перад законам. «Аб'ект павінен быць выключна экалагічна чысты, абавязкова, калі мы яго будзем уводзіць, з экспертызай мясцовага насельніцтва. Толькі людзі будуць вырашаць, якім будзе гэты завод», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка закрануў тэму палітызацыі падобных тэм. Тым, хто выкарыстоўвае экалагічную тэму ў палітычных мэтах, беларускі лідар параіў падумаць, што яны будуць рабіць ва ўладзе. «Хачу супакоіць людзей: сённяшняя ўлада і не з такімі праблемамі разбіралася, і гэту мы вырашым так, як трэба брастаўчанам», — запэўніў ён.

Аб шматвектарнай палітыцы

Другое пытанне журналістаў датычылася знешняй палітыкі Беларусі і меркаванняў некаторых палітолагаў пра разварот афіцыйнага Мінска на Захад.

Аляксандр Лукашэнка паўтарыў, што Беларусь заўсёды прытрымлівалася шматвектарнасці ў пабудове сваіх міжнародных адносін і працягвае гэту палітыку. «Не я пасяліў беларусаў на гэтым кавалку зямлі. Гасподзь нас тут пасяліў, куды нам падзецца? Нас нідзе не чакаюць. Іншай зямлі нам ніхто не дасць. У рабы мы не пойдзем, ужо пахадзілі, як я кажу, пад бізуном пабывалі. Гэта наш кавалак зямлі, і ён у цэнтры Еўропы, на перакрыжаванні ўсіх шляхоў», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Вядома, што за гэту зямлю вядзецца вострая, хоць часам нябачная барацьба, сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Усе хочуць уплываць, — з горыччу заўважыў ён. — Але я не прымаю, калі пачынаюць «уплываць» празмерна, не на карысць нашаму народу. Гэта недапушчальна. Галоўнае — шматвектарная палітыка: мы павінны глядзець і на ўсход, і на захад. Дарэчы, Расіі няма ў чым нас папракаць, у іх нават арол двухгаловы (на дзяржаўным гербе Расійскай Федэрацыі. — **«Звязда»**), і нам нікто не забароніць глядзець у розныя бакі».

Прэзідэнт зноў паўтарыў сваё перакананне, што беларусы і расіяне — родныя людзі. Але і старэйшы брат павінен адносіцца па-брацку, заўважыў Аляксандр Лукашэнка. У якасці прыкладу ён прывёў перагаворы ў сферы паставак прыроднага газу і нафты. У сувязі з гэтым Прэзідэнт згадаў і тое, што Расія стала праваераемніцай Савецкага Саюза і што ёй як праваераемніцы Беларусь у свой час перадала сваю ядзерную зброю.

«Я заўсёды казаў: гэта адзіная наша Айчына. Мы так выбудоўвалі сваю палітыку. Я і Пуціну (Ельцыну само сабой) казаў: гэта і мая Расія. Гэта мая краіна. Бо беларусы душу сваю ўклалі ў развіццё той краіны, у тым ліку Расіі. Як ленінградцы аднаўлялі пасля вайны Мінск, вучоныя сюды прыязджалі... Усё пераплеценае, усё адзінае. Але Чарнобыль адбыўся, і мы там драўніну не можам выкарыстоўваць з-за высокіх накапленняў радыяцыі. Хоць за гэта мільярдаў 10-15 кубаметраў газу па прымальных цэнах, не бясплатна, не стратна для Газпраму, пастаўце ў Беларусь», — разважае кіраўнік дзяржавы.

Калі Беларусь папракаюць, што яна жыве за кошт Расіі, то мы зможам і абысціся, заявіў Аляксандр Лукашэнка. Як расіянам надакучыла спрачацца з транзіцёрамі газу і яны сталі будаваць альтэрнатыўныя трубаправоды, так і Беларусь можа ўзяць з рынка іншую нафту, акрамя расійскай. «Але ці трэба гэта Расіі? Каб на яе рынак прыйшло 20-25 мільёнаў тон чужой нафты — амерыканскай, Саудаўскай Аравіі, азербайджанскай... Праз Украіну ў нас на Мазыр прапрацаваны маршрут. 10 мільёнаў тон венесуэльскай нафты мы пастаўлялі, калі Расія нам перастала пастаўляць. Мы замясцілі. Паўночны маршрут, я наўпрост сказаў расійскім уладам, мы прапрацоўваем. І праз Польшчу, праз Прыбалтыку напрацоўкі ёсць. Але калі мы праз Польшчу пачнём пастаўляць нафту, то забяром дзве ніткі нафтаправода «Дружба», па якіх на экспарт ідзе расійская нафта. Гэта трэба расіянам? Не. Дык давайце дамаўляцца па-чалавечы і рабіць як лепш, — патлумачыў сваю пазіцыю Прэзідэнт. — Гэта мае патрабаванні. Не трэба гэта падаваць як тое, што Лукашэнка развярнуўся на Захад».

Што датычыцца спекуляцый вакол візіту дарадцы прэзідэнта ЗША па нацыянальнай бяспецы Джона Болтана, Аляксандр Лукашэнка заўважыў: «Ён што, прыехаў перш за ўсё ў Беларусь? Ды не, ён ужо пабываў і ў Сочы, і ў Маскве, і з маім сябрам, калегам Пуціным абдымаўся там. Мы ж спакойна гэта пераносілі. Не абураліся. Ну прыехаў і прыехаў. Трэба размаўляць. Тым больш нам — краіне якая была столькі пад санкцыямі. Яны нас нахілялі ўлева і ўправа і самі прыехалі, самі прапанавалі сустрэцца. А чаму мы не павінны гэта рабіць?» Прэзідэнт Беларусі дадаў, што кіраўніцтва Расіі яго ў такой палітыцы не папракае, шум паднялі журналісты. Пена схлыне, і ўсё будзе развівацца і абмяркоўвацца ў канструктыўным рэчышчы, упэўнены ён.

Аб спартыўных форумах

Яшчэ адно пытанне кіраўніку дзяржавы датычылася вопыту правядзення нашай краінай маштабных спартыўных форумаў, лёгкаатлетычнага матча паміж Еўропай і ЗША, які адбудзецца ў Мінску на пачатку наступнага тыдня, і магчымых будучых глабальных спаборніцтваў на тэрыторыі Беларусі.

«Я вельмі хацеў, каб гэты матч лёгкаатлетычны прайшоў у Беларусі», — прызнаўся Прэзідэнт. Ён паведаміў, што ў свой час прасіў кіраўніка Міжнароднай асацыяцыі лёгкаатлетычных федэрацый Себасцьяна Коэ даверыць Беларусі правядзенне гэтых спаборніцтваў. «Я яго папрасіў, потым думаю: не дадуць нам пры такой палітызацыі... А яны аддалі нам правядзенне гэтага матча. Не кожнай краіне выпадае такі гонар. Любая краіна гатовая прыняць такі матч — Еўропа — ЗША. Таму мы ганарымся тым, што нам дазволілі яго правесці», — сказаў Прэзідэнт.

Што датычыцца будучых спаборніцтваў, то і набыты Беларуссю вопыт дазваляе нам разлічваць на не менш цікавыя форумы сусветнага маштабу. «Вядома, нам цяжка спаборнічаць з гігантамі (вялікімі краінамі), але, дапусцім, з украінцамі або расіянамі мы можам Алімпіяду правесці», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што краіне выгадна праводзіць буйныя спартыўныя спаборніцтвы: «Паціху мы вучымся. І прымаць гасцей. Гэта не ва ўрон, гэта твар краіны, імідж».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пры правядзенні II Еўрапейскіх гульняў летам бягучага года былі сэканомлены сродкі. «Нават не ўсе выкарысталі, што выдзялялі. Мы нічога не страцілі. Толькі ў плюс», — сказаў ён.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што дзякуючы правядзенню падобных спартыўных форумаў Беларусь імкнецца зарэкамендаваць сябе са станоўчага боку ў якасці краіны-гаспадыні, каб і ў будучыні мець магчымасць прымаць падобныя або нават больш значныя спаборніцтвы. «Без гэтага не было б заўтра ні чэмпіянатаў свету, ні этапаў Кубка свету. Усе ўбачылі, што мы не проста можам іх правесці — мы можам прыняць людзей. А следам тысячы, сотні тысяч прыедуць у Беларусь. Гэта турызм, за які мы змагаемся. мы закладаем добрую аснову для таго, каб да нас прыязджалі, нас любілі, нас паважалі. І каб нашы спартсмены нас радавалі», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Святлана ЯСКЕВІЧ.

Гэта цікава

Заходні абход Брэста — унікальная для краіны маналітная канструкцыя даўжынёй 2 кіламетры 200 метраў. Будаўніцтва пачалося тры гады таму, яно ішло паралельна з праектаваннем. У палатно моста другой чаргі Заходняга абходу ўкладзена больш за 800 балак.

«Такая маналітная пабудова ў краіне выкарыстана ўпершыню. Канструктыўная асаблівасць у тым, што таўшчыня яе метр, яна зроблена ў двух узроўнях, унутры ёсць пустоты, каб такую бетонную канструкцыю несці. Але самая галоўная асаблівасць у тым, што мы не спынялі рух: залівалі ў пяць этапаў, інакш быў бы транспартны калапс у горадзе, — патлумачыў генеральны дырэктар Будаўнічага трэста № 8 Павел Сацута.

На пытанне журналіста «Звязды», колькіх бяссонных начэй каштавала кіраўніку генеральнага падрадчыка гэта будаўніцтва, Павел Сацута адказаў: «Два гады і тры месяцы».

«Самым цікавым было заліваць маналіт, — расказаў ён. — Мы навучыліся ліць такія сур'ёзныя маналіты дзякуючы сямігадоваму вопыту работы на атамнай станцыі. Мы сёння любыя маналітныя аб'екты навучыліся будаваць удвая хутчэй, чым раней». Самы вялікі аб'ём бетону, які выкарыстоўваўся адначасова пры будаўніцтве Брэсцкай развязкі, — 1280 кубаметраў.

«Трыма помпамі залівалі цягам сутак, каб зрабіць бесперапыннае бетанаванне і забяспечыць якасць, каб бетон не перасыхаў і была забяспечана рухомасць бетоннай сумесі», — падзяліўся з журналістамі нюансамі будаўніцтва гендырэктар.

«Азбука грамадзяніна» для маладых выбаршчыкаў

9 верасня Гомельская абласная арганізацыя БРСМ дае старт праекту «Азбука грамадзяніна» — інтэрактыўнай дзелавой гульні, скіраванай на павышэнне электаральнай актыўнасці юнакоў і дзяўчат, які напярэдадні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання будзе рэалізаваны ва ўсіх раёнах Гомельшчыны з удзелам маладых выбаршчыкаў, у тым ліку і тых, хто галасуе ўпершыню.

Першая дзелавая гульня «Азбука грамадзяніна» адбудзецца ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Францыска Скарыны. Яна аб'яднае больш за паўсотні будучых выбаршчыкаў — першакурснікаў установ вышэйшай адукацыі горада над Сожам. Падзяліўшыся на тры каманды для больш зручнага мазгавога штурму, студэнцкая моладзь на працягу акадэмічнай гадзіны пры дапамозе мадэлявання розных сітуацый будзе ўцягнутая ў працэсы ўзаемадзеяння між сабой.

Дзелавая гульня складаецца з пяці блокаў. Першыя чатыры — інтэрактыў, нацэлены на абнаўленне базы ведаў па форме дзяржаўнага кіравання, парламенцкай сістэме, парадку фарміравання і работы Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, функцыях парламента і дэпутацкага корпуса. Пяты — непасрэдна сама гульня, падчас якой маладыя людзі прымераць на сябе ролю грамадскіх і палітычных дзеячаў і паўдзельнічаюць у працэсе разгляду законапраекта і канчатковага прыняцця закона.

Праект «Азбука грамадзяніна», які не мае аналагаў у Беларусі, ініцыяваны Гомельскім гарадскім камітэтам БРСМ сумесна з юрыдычным факультэтам Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СТАЎКА НА МОЛАДЗЬ

Маладыя вучоныя Акадэміі навук ва ўзросце да 35 гадоў складаюць больш за 25 % ад агульнай колькасці даследчыкаў.

Пра гэта паведаміў **Старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ** падчас урачыстага мерапрыемства, прысвечанага пачатку новага навучальнага года ў Інстытуце падрыхтоўкі навуковых кадраў.

— Сёння ў НАН Беларусі створаны неабходныя ўмовы для паспяховай навуковай дзейнасці. Усе навучэнцы акадэмічнай магістратуры і аспірантуры, а таксама маладыя навуковыя супрацоўнікі забяспечаны жыллём, штогод праводзяцца розныя спартыўныя і культурна-масавыя мерапрыемствы. Апошнім часам значна актывізаваў дзейнасць Савет маладых вучоных, — адзначыў кіраўнік НАН.

Уладзімір Гусакоў паведаміў, што Савет аб'ядноўвае больш за 2500 маладых вучоных Акадэміі навук ва ўзросце да 35 гадоў, што складае звыш 25 % ад агульнай колькасці даследчыкаў. Ён адзначыў, што таленавітая моладзь знаходзіць падтрымку ўсіх сваіх пачынанняў.

— Сёння ў НАН Беларусі ёсць усё неабходнае не толькі для арганізацыі навуковых даследаванняў, але і для атрымання якаснай адукацыі дзякуючы шырокаму выкарыстанню сучасных адукацыйных тэхналогій, развіццю матэрыяльнай базы і інавацыйных праектаў, — заўважыў Уладзімір Гусакоў.

У новым навучальным годзе ў Інстытуце падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН Беларусі пачалі вучобу 124 магістранты, якія будуць навучацца па 11 спецыяльнасцях. Усе яны выпускнікі вядучых ВНУ краіны — БДУ, БДУІР, БНТУ, БДЭУ, БДПУ і іншых. Сярод абітурыентаў, якія паступалі сёлета, найбольш запатрабаванымі аказаліся такія спецыяльнасці, як «мастацтвазнаўства», «эканоміка», «фізіка», «біялогія», «хімія». Выпускнікі дзённай бюджэтнай формы навучання падлягаюць размеркаванню і накіроўваюцца пераважна ў навуковыя арганізацыі НАН Беларусі. Навучанне студэнтаў на другой ступені вышэйшай адукацыі ў магістратуры ажыццяўляецца ў Інстытуце падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН Беларусі з 2007 года.

Алена КРАВЕЦ.

Як нас дураць

Трымай тэлефон у сваіх руках

Упраўленне Следчага камітэта па Гродзенскай вобласці расследуе крымінальную справу, якая распачатая ў дачыненні да 27-гадовага Кірыла Л., жыхара Гродна. Малады чалавек падазраецца ў здзяйсненні шэрагу ашуканскіх дзеянняў.

Па даных следства, мужчына звяртаўся з просьбай да знаёмых і не вельмі знаёмых людзей даць яму на некалькі хвілін мабільны тэлефон, каб зняць наяўныя грошы нібыта са свайго рахунку, пасля чаго пры дапамозе банкаўскіх мабільных праграм афармляў заяўкі на гэтых людзей (вядома, без іх згоды і ведама), на падставе якіх і выдаваліся анлайн-крэдыты. Пералічаныя сродкі пацярпелыя перадавалі падазраванаму.

У ходзе праверкі атрыманых даных установлена, што на гэты момант ад яго дзеянняў пацярпела больш за 50 чалавек, усе яны — жыхары Гродна і Гродзенскага раёна. Агульны ўрон складае больш як 250 тысяч рублёў.

Высвятленне ўсіх абставін здзяйснення супрацьпраўных дзеянняў працягваецца, праводзяцца неабходныя следчыя дзеянні. Гродзенец знаходзіцца пад вартай. У следства ёсць падставы меркаваць, што падобных фактаў можа быць больш. Таму ў міліцыі нагадваюць пра неабходнасць абароны даных сваіх банкаўскіх картаў, пароляў, іншай значнай інфармацыі. Ды і мабільныя тэлефоны не трэба перадаваць у чужыя рукі.

Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Памёр Роберт Мугабе

Былы прэм'ер-міністр і прэзідэнт Зімбабве Роберт Мугабе памёр учора ва ўзросце 95 гадоў у Сінгапуры, дзе апошнім часам праходзіў лячэнне.

Роберт Мугабе стаў прэм'ер-міністрам Зімбабве пасля абвяшчэння яе незалежнасці і ліквідацыі расава-дыскрымінацыйнага рэжыму ў 1980 годзе. У 1987 годзе стаў прэзідэнтам краіны. Аж да сваёй адстаўкі ў 2017 годзе з'яўляўся самым пажылым дзеючым кіраўніком дзяржавы на планеце.

15 лістапада 2017 года атрады ваенных захапілі кантроль над сталіцай, змясцілі Мугабе і яго сям'ю пад хатні арышт і праз тыдзень прымусілі яго датэрмінова скласці паўнамоцтвы.

У абмен на добраахвотную адстаўку Мугабе атрымаў судовы імунітэт, разавую выплату ў памеры 5 млн долараў, пажыццёвае забеспячэнне і іншыя прывілеі.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне Прэзідэнту Зімбабве Эмерсану Мнангагве ў сувязі са смерцю вядомага дзяржаўнага дзеяча і былога прэзідэнта гэтай краіны Роберта Габрыэля Мугабе.

«П'яны» рэйтынг

Сусветная арганізацыя аховы здароўя (САЗ) склала рэйтынг 30 еўрапейскіх краін па ступені ўжывання алкаголю.

Паводле вынікаў даследавання, найбольш пітушчай краінай рэгіёна аказалася Літва, дзе выпіваюць у сярэднім 15 л спірту на чалавека ў год. У 2017 годзе эксперты САЗ ужо называлі гэтую краіну самай пітушчай не толькі ў Еўропе, але і ў свеце. За Літвой у рэйтынгу ідуць Чэхія (14,4 л) і Германія (13,4 л). Па звестках САЗ, у сярэднім еўрапеец, старэйшы за 15 гадоў, выпівае больш за дзве бутэлькі віна ў тыдзень. Штогод у Еўропе па звязаных з алкаголем прычынах памірае больш за 290 тыс. чалавек.

Даследаванне САЗ праводзілася з 2010 да 2016 года ў краінах Еўрапейскага саюза, а таксама Нарвегіі і Швейцарыі.

Аўтарам фатаграфіі чорнай дзіркі дасталіся $3 млн

Калектыву з больш чым 300 вучоных з усяго свету прысудзілі прэмію «За прарыў у галіне фізікі» (Breakthrough Prize in Fundamental Physics) за стварэнне першай выявы чорнай дзіркі. Грашовы эквівалент узнагароды, якую называюць «навуковым Оскарам», складае $3 млн.

Узнагароду прысудзілі «за першую выяву супермасіўнай чорнай дзіркі, зробленую з дапамогай аб'яднання тэлескопаў памерам з Зямлю». $3 млн падзеляць 347 вучоных, якія ўваходзяць у сумесны праект Event Horizon Telescope («Тэлескоп гарызонту падзей»).

Каб сфатаграфаваць аб'ект, які знаходзіцца ў цэнтры галактыкі M87 у сузор'і Дзевы, навукоўцы аб'ядналі ў адну сетку восем радыётэлескопаў на чатырох кантынентах. Праўда, гэта не фатаграфія ў звыклым сэнсе: на здымку бачны толькі цень аб'екта. Вучоныя праводзілі назіранні на працягу некалькіх тыдняў вясной 2017 і 2018 гадоў. Сумарны аб'ём даных, які перадавалі вучоныя для таго, каб стварыць здымак, вымяраўся петабайтамі.

Фінансы

ЗОЛАТАВАЛЮТНЫЯ РЭЗЕРВЫ ДАСЯГНУЛІ АМАЛЬ 9 МІЛЬЯРДАЎ ДОЛАРАЎ

Гэта новы абсалютны максімум

Міжнародныя рэзервовыя актывы нашай краіны на 1 верасня, паводле папярэдніх звестак, склалі 8,891 млрд долараў у эквіваленце.

Як паведамляюць спецыялісты Нацыянальнага банка краіны, за жнівень золатавалютныя рэзервы выраслі на 263,1 млн долараў (на 3 %) пасля росту ў ліпені на 337,2 млн долараў (на 4,1 %). З пачатку года рэзервы выраслі на 24,2 %. Цяперашні ўзровень рэзерваў, адзначаюць эксперты, дастатковы для падтрымання фінансавай стабільнасці ў краіне. Рэкамендаваны МВФ мінімальны крытэрый — рэзервы павінны пакрываць два месяцы імпарту. Па іншых крытэрыях гаворка ідзе пра тры месяцы. У месяц Беларусь імпартуе тавараў прыблізна на 3,5 млрд долараў.

Варта заўважыць, што ў жніўні ўрад і Нацбанк выканалі знешнія і ўнутраныя абавязацельствы ў замежнай валюце на суму каля 550 млн долараў. Пры гэтым павелічэнню ўзроўню золатавалютных рэзерваў спрыялі купля Нацбанкам валюты на таргах Беларускай валютна-фондавай біржы; паступленне сродкаў ад продажу Мінфінам аблігацый, намінаваных у замежнай валюце; павелічэнне кошту манетарнага золата і паступленне валюты ў бюджэт, у тым ліку ад збірання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты.

ЖЫЦЦЁ Ў ДОЎГ

Беларусы павінны банкірам ужо амаль 13 мільярдаў рублёў

Мы з вамі па-ранейшаму больш спадзяёмся на пазыковыя сродкі банкаў і актыўна карыстаемся гэтай паслугай. Грамадзяне нашай краіны днямі ўстанавілі чарговы крэдытны рэкорд. Паводле інфармацыі Нацыянальнага банка, па стане на 1 жніўня запазычанасць па крэдытах фізічных асоб склала 12 млрд 824,4 млн рублёў. У гэтую суму ўваходзяць спажывецкія крэдыты, крэдыты на нерухомасць, на аўтамашыны, а таксама карты растэрміноўкі.

Спецыялісты рэгулятара падлічылі, што за ліпень крэдытныя пазыкі нашых суайчыннікаў выраслі на 252,4 млн рублёў, з пачатку года — больш чым на 1 млрд 227 млн рублёў. Адзнаку ў 12 млрд рублёў мы пераадолелі ў маі, а ў верасні нас чакае новы рэкорд?

Агульны доўг нашых грамадзян па крэдытах на спажывецкія патрэбы на пачатак жніўня склаў 4 млрд 998,3 млн рублёў (за ліпень гэтая сума выросла на 139,8 млн рублёў). Сюды ўваходзяць як спажывецкія крэдыты, так і карты растэрміноўкі. Запазычанасць у крэдытах на нерухомасць склала 7 млрд 826,1 млн рублёў (яна за ліпень выросла на 112,6 млн рублёў, а ў параўнанні з пачаткам года — на 614,9 млн рублёў).

Эксперты фінансавага рынку нашай краіны адзначаюць, што крэдыты часам бяруць людзі, якія не зусім рэальна ацэньваюць свае «грашовыя» магчымасці. Пэўная частка даўжнікоў разлічвае, што значная вага доўгу паменшыцца пад напорам інфляцыі, якая будзе расці. Гэтыя пажаданні даўжнікоў не апраўдваюцца.

У сувязі з гэтым сёлета ў красавіку ў Нацыянальным банку адзначалі, што не выключаюць верагоднасці ўзмацнення жорсткасці выдачы спажывецкіх крэдытаў, калі аб'ём крэдытавання працягне расці. Як вядома, летась галоўны банк краіны ўжо ўвёў некаторыя абмежавальныя меры і ўстанавіў каэфіцыент пазыковай нагрузкі, калі штомесячны плацеж не павінен перавышаць 40 % прыбытку кліента. Акрамя таго, з кастрычніка мінулага года пачалі дзейнічаць змяненні ў Банкаўскі кодэкс. Цяпер банкі не маюць права змяняць стаўкі па выдадзеных крэдытах у аднабаковым парадку.

НА ПАЎМІЛЬЯРДА БОЛЬШ

Жыхары нашай краіны за сем месяцаў гэтага года прадалі валюты на 497,2 млн долараў больш, чым купілі. Пра гэта сведчаць статыстычныя звесткі Нацыянальнага банка.

За студзень — жнівень фізічныя асобы прадалі наяўнай і безнаяўнай валюты на суму 6 млрд 345,7 млн долараў у эквіваленце, купілі — на 5 млрд 848,5 млн долараў. Чысты продаж замежнай валюты фізічнымі асобамі склаў амаль паўмільярда. Суб'екты гаспадарання — рэзідэнты Беларусі прадалі замежнай валюты на 14 млрд 273,1 млн долараў у эквіваленце, купілі на 13 млрд 712,8 млн долараў. Нерэзідэнты за гэты час прадалі валюты на 564,2 млн долараў у эквіваленце, купілі — на 149,5 млн долараў.

Сяргей КУРКАЧ.

Адукацыя

ДАСТУПНА І ЯКАСНА

Чаму студэнты-замежнікі выбіраюць Беларусь і ў якія ВНУ паступаюць?

З кожным годам цікавасць замежных грамадзян да атрымання адукацыі ў Беларусі расце, беларускія ВНУ ў сваю чаргу імкнуцца зрабіць працэс навучання цікавым. З новага навучальнага года ў дарогу па веды ў аўдыторыях беларускіх вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў адправіліся 23 тысячы студэнтаў са 108 краін свету. Найбольшая колькасць замежнікаў традыцыйна вучыцца ў БДУ, сталічным медыцынскім універсітэце і БНТУ. Таксама ў апошнія гады вырасла запатрабаванасць сярод замежных студэнтаў ІТ-спецыяльнасцяў, на якія актыўна пачаў запрашаць Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. У тройцы краін, адкуль да нас прыязджае найбольшая колькасць студэнтаў, — Туркменістан, Кітай і Расія.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Лідарамі па колькасці замежных студэнтаў, безумоўна, з'яўляюцца сталічныя ВНУ з прычыны свайго выйгрышнага размяшчэння. Гэта БДУ, БДМУ, БНТУ, БДУІР, лінгвістычны і педагагічны ўніверсітэты. Разам з гэтым у апошнія гады мы назіраем станоўчую дынаміку і ў рэгіёнах — Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава, Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы, Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Францыска Скарыны. Рост колькасці замежных студэнтаў назіраецца і ў Полацкім дзяржаўным універсітэце, — расказвае **кансультант упраўлення міжнароднага супрацоўніцтва Міністэрства адукацыі Вольга ХАТКЕВІЧ.**

Спецыяліст паведаміла, што 27 беларускіх ВНУ гатовы навучаць (і навучаюць) студэнтаў на англійскай мове па 181 спецыяльнасці на першай ступені вышэйшай адукацыі. З 2012-га года актыўна развіваецца такі кірунак, як сумесныя праграмы. Яны існуюць у многіх ВНУ, напрыклад, у БНТУ маецца сумесны факультэт з Таджыкскім нацыянальным універсітэтам, сёлета такі ж сумесны з таджыкскім універсітэтам факультэт з'явіўся ў Полацкім дзяржаўным універсітэце.

— Нашы ўніверсітэты могуць прапанаваць цікавыя адукацыйныя праграмы не толькі на англійскай, але і іншых мовах, напрыклад, ёсць практыка выкладання на французскай, — адзначыла Вольга Хаткевіч.

Лідарам па экспарце адукацыйных паслуг сярод беларускіх ВНУ з'яўляецца Белдзяржуніверсітэт. Тут вучыцца самая вялікая колькасць замежных студэнтаў.

— Мы адна з чатырох на тэрыторыі Беларусі ВНУ, куды замежныя студэнты ўпершыню прыехалі яшчэ 60 гадоў таму, — нагадвае **начальнік упраўлення міжнародных сувязяў БДУ Аляксандр ЖУК.** — Сёння ў нас вучыцца больш за 2,5 тысячы замежных грамадзян. А з улікам залічэння ў гэтым навучальным годзе будзе каля трох тысяч. Пераважная большасць нашых замежных студэнтаў з Туркменістана, Кітая і Расіі.

Пры гэтым каля 80 % замежнікаў выбіраюць сацыяльна-эканамічныя і філалагічныя спецыяльнасці.

— Гэта эканамічны і юрыдычны, факультэты журналістыкі і міжнародных адносін. У нас не вельмі загружаны ў гэтым плане прыродазнаўчанавуковыя спецыяльнасці, — адзначае **дэкан факультэта даўніверсітэцкай адукацыі БДУ Вячаслаў МАЛАФЕЕЎ.** — Таму мы робім акцэнт на сумесныя праграмы. Адна з іх — сумесны інстытут з Даляньскім універсітэтам Кітая, дзе студэнты атрымліваюць спецыяльнасць, звязаную з фізікай і інфармацыйнымі тэхналогіямі. Навучанне вядзецца на англійскай мове. Мяркуемы работадаўца — Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень».

Медыцынскую адукацыю замежныя грамадзяне атрымліваюць ва ўсіх чатырох профільных ВНУ Беларусі, а таксама ў Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі і Рэспубліканскіх навукова-практычных цэнтрах. Толькі ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце іх вучыцца больш за дзве тысячы замежнікаў.

— Медыцынская адукацыя запатрабаваная ва ўсім свеце і каштуе дорага. У Беларусі яна даступная і якасная. Ва ўсіх медыцынскіх ВНУ выкладанне вядзецца як на рускай, так і на англійскай мовах. Рускую замежныя студэнты вывучаюць з 1-га курса, бо з трэцяга ў іх пачынаюцца клінічныя прадметы. Урачом не станеш без кантактавання з пацыентам, менавіта падчас практыкі фарміруецца клінічнае мысленне. Пасля выпускнікоў чакае клінічная ардынатура, якая складае ад трох гадоў (у беларускіх студэнтаў — 2 гады). І руская мова — даволі складаны для замежных студэнтаў момант, але па-іншаму тут нельга, — тлумачыць **прарэктар па міжнародных сувязях Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Васіль РУДЗЁНАК.**

Студэнт 5-га курса БДМУ Ахмед з Іарданіі вырашыў вучыцца ў Беларусі, бо ад сяброў ведаў, што тут выкладчыкі вельмі добра ставяцца да замежных студэнтаў.

— Так і выйшла: да нас адносяцца, як бацькі да сваіх дзяцей. Мы стараемся вучыцца, але з рускай мовай не заўсёды ўсё атрымліваецца, і выкладчыкі з разуменнем да гэтага ставяцца, — прызнаецца Ахмед, які плануе застацца ў Беларусі для праходжання клінічнай ардынатуры.

Традыцыйна ў медыцынскіх універсітэтах шмат студэнтаў з такіх краін, як Індыя, Шры-Ланка, Лівія і Іарданія. Упершыню на постсавецкай прасторы ў БДМУ рэалізуецца эксперыментальны праект для грамадзян Ізраіля, ЕС, ЗША і Канады. Ён прадугледжвае атрыманне медыцынскай адукацыі з улікам далейшай здачы экзамену для допуску да работы ў гэтых краінах. Першая група такіх студэнтаў ужо прыступіла да навучання.

— У тым жа Ізраілі ўсяго чатыры медыцынскія ВНУ і 650 месцаў, а попыт на медыцынскую адукацыю вялікі, таму мяркую, што наш праект мае добрыя перспектывы, — кажа Васіль Рудзёнак.

З гэтага года Беларусь пачала выдаткоўваць гранты для замежнікаў на бясплатнае навучанне. Плануецца штогод вылучаць да 100 грантаў прадстаўнікам 34 краін свету. Сёлета такой магчымасцю скарысталіся і сталі студэнтамі 22 замежнікі з Кітая, Азербайджана, Бельгіі, Узбекістана, Літвы, Іарданіі, Лівана, Латвіі, Сірыі, Егіпта, Буркіна-Фасо і Манголіі. Яны прайшлі чатырохузроўневы адбор, дзе галоўным крытэрыем з'яўляецца паспяховасць — ніжні парог атэстата павінен быць не ніжэй за 7,5 бала. Пры гэтым вучыцца ў Беларусі пажадаў 41 чалавек з тых, хто звярнуўся ў пасольствы Беларусі ў сваіх краінах і падаў заяўкі.

Алена КРАВЕЦ.

У ліку найлепшых

WORLDSKILLS INTERNATIONAL ЯК СТАРТ У БУДУЧЫНЮ

Беларуская зборная заваявала чатыры медалі выдатнікаў на міжнародным спаборніцтве WorldSkills International у Казані. Гэта найбуйнейшы ў свеце конкурс прафесійнага майстэрства, і праводзіцца ён кожныя два гады. Цяперашні 45-ы па ліку чэмпіянат — самы маштабны ў гісторыі руху WorldSkills, у 56 кампетэнцыях спаборнічалі 1 354 маладыя прафесіяналы з 63 краін і рэгіёнаў. Ацэньвалі іх 1 304 эксперты. Канкурсанты дэманстравалі ўзровень сваёй прафесійнай падрыхтоўкі і кваліфікацыю, а таксама ўменне індывідуальна ці ў камандзе выконваць заданні. Беларусь удзельнічала на WorldSkills International па 33 кампетэнцыях, пачынаючы ад дэманстрацыі кулінарных шэдэўраў да тэхналогій будаўніцтва.

Беларусь далучылася да WorldSkills International у 2014 годзе і паспела прыняць удзел у двух сусветных чэмпіянатах — у Сан-Паўлу ў 2015 годзе і ў Абу-Дабі ў 2017-м. Аб гэтым расказала **прарэктар па навукова-метадычным забеспячэнні якасці прафесійнай адукацыі Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Наталля ШАЎЧЭНКА-САЎЛАКОВА.**

— Сёлета наша каманда выступіла ў кампетэнцыях, 30 з якіх уваходзяць у асноўны блок, тры дадатковыя — Future Skills (зона спаборніцтваў па перспектыўных прафесіях, запатрабаваных ва ўмовах высокатэхналагічнай вытворчасці і лічбавай эканомікі). Медалі выдатнікаў атрымалі хлопцы і дзяўчаты, якія спаборнічалі па чатырох кампетэнцыях: у «Цырульніцкім мастацтве» Ксенія Шафранская, навучэнка Брэсцкага дзяржаўнага каледжа сферы абслугоўвання, у кампетэнцыі «Вэб-дызайн і распрацоўка» ўзнагароду атрымаў Аляксей Крупскі, студэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі, па кірунку «Тэхналогія моды» — Юлія Маркевіч, навучэнка Гродзенскага дзяржаўнага каледжа тэхнікі, тэхналогій і дызайну, выпускнік Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі Валянцін Арцямёнак, ён выступаў па кампетэнцыі «Інфармацыйныя кабельныя сеткі», — паведаміла выступоўца.

Акрамя таго, зборная ўдзельнічала ў пяці кампетэнцыях JuniorSkills — праграму спаборніцтваў для школьнікаў да 16 гадоў. Сярэбранымі медалямі былі ўзнагароджаны Максім Цароў (кампетэнцыя «Тэхналогіі графічнага дызайну»), Мікіта Штраус («Полімеханіка і аўтаматызацыя»), Максім Парфіяновіч («Упраўленне дронамі»), Ілья Мельнікаў і Мілана Казлова («Інтэграцыя робатасістэм»). Бронзавым прызёрам у кампетэнцыі «Вэб-тэхналогіі» стаў Ілья Калько.

Тэхнічны дэлегат WorldSkills Belarus Кацярына ЗАБРУДСКАЯ адзначыла, што кірунак Future Skills, у якім выступала беларуская зборная, цяпер актуальны і перспектыўны для нашай краіны:

— На юбілейным спаборніцтве прафесійнага майстэрства WorldSkills International беларуская зборная выступіла па трох кампетэнцыях гэтага кірунку: прамысловы дызайн, квантавыя тэхналогіі і BIM-тэхналогіі — тэхналогіі інфармацыйнага мадэлявання ў будаўніцтве. Кірунак Future Skills раней не быў задзейнічаны ў конкурснай праграме, аднак цяпер кампетэнцыі разглядаюцца як асноўныя і перспектыўныя для будучых спаборніцтваў. Нашы хлопцы і дзяўчаты заваявалі ў іх узнагароды: у кампетэнцыі «Прамысловы дызайн» Зміцер Дорахаў, навучэнец Мінскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа Філіяла БНТУ, атрымаў бронзавы медаль, каманда Вольгі Петравец, якая прадстаўляла прадпрыемства комплекснага праектавання «Гомель-дарпраект», і Марыны Жукавай з Дзяржаўнага інстытута па праектаванні прадпрыемстваў машынабудавання для жывёлагадоўлі і кормавытворчасці заваявала сярэбраны медаль у кампетэнцыі «Тэхналогіі праектавання BIM».

Спаборніцтвы — цяжкая і адказная праца як для ўдзельнікаў, так для экспертаў і трэнераў. Каб стаць міжнародным экспертам, патрабуецца спецыяльная падрыхтоўка, адпаведнае пацвярджэнне і сертыфікаты, для канкурсантаў — на працягу года інтэнсіўнае навучанне і стажыроўкі, у тым ліку за мяжой. Пра гэта расказала **нацыянальны эксперт па кампетэнцыі «Цырульніцкае мастацтва» Наталля КРЫЛОВА:**

— Ганарова, што адзін эксперт з беларускай каманды для WorldSkills International быў выбраны ў якасці намесніка галоўнага эксперта спаборніцтваў. Добра, што многія з айчынных удзельнікаў становяцца потым педагогамі, майстрамі вытворчага навучання або экспертамі спаборніцтваў. Іх медалі, — гэта паказчык якасці і прафесіяналізму, які не трэба пацвярджаць ні ў адной краіне.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

НА ПЕНСІІ — НЕ РАСКІСАЦЬ, А ВАЛАНЦЁРЫЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ні для каго не навіна, што пасля выхаду на пенсію з'яўляецца вольны час, і яго можна праводзіць у тым ліку з карысцю для грамадства. Прычым спецыялісты кажуць, што ад гэтага выйграе і сам пажылы чалавек: ён адчувае сябе больш карысным і запатрабаваным, пашыраецца яго кола зносін, з'яўляюцца новыя інтарэсы...

Дапамагаюць і атрымліваюць дапамогу самі

Можа таму на сённяшні дзень, па словах **старшыні Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа Алены ФАДЗЕЕВАЙ,** з прыблізна 1000 валанцёраў іх арганізацыі больш за 200 складаюць людзі пенсійнага ўзросту.

На Захадзе актыўны валанцёрскі рух пачаўся пасля Другой сусветнай вайны, калі трэба было аднаўляць разбуранае жыццё. Цяпер асноўны кантынгент валанцёраў там складаюць студэнты і пенсіянеры.

Пажылыя мінчане рэалізуюць самыя розныя ініцыятывы. Яны выступаюць бясплатнымі рэпетытарамі для дзяцей з праблемных сем'яў, дапамагаюць выхаванкам дамоў-інтэрнатаў у доглядзе за іх дзецьмі, імкнуцца разнастаіць вольны час адзінокіх састарэлых людзей. Удзельнічаюць, напрыклад, у такіх міні-праектах, як «Бабулін клопат», «Майстэрня здароўя», «Пераемнасць па-

каленняў», «Разам супраць дэменцыі», «Тэрапеўтычны парк» і іншых.

У цэлым па краіне дзейнічаюць 53 ініцыятыўныя групы пажылых людзей. Яны створаны ў Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай абласцях і аб'ядноўваюць больш за тысячу чалавек.

Удзельнікі ініцыятыўных груп дапамагаюць сваім падапечным з прыборкай, дастаўляюць прадукты з крамы, апрацоўваць прысядзібныя ўчасткі. Не менш важна часта бывае і суправадзіць пажылога чалавека ў паліклініку ці царкву, дапамагчы напісаць ліст, павіншаваць са святам або проста пагаварыць.

Акрамя гэтага, пажылыя людзі праводзяць заняткі з дзецьмі-інвалідамі, аказваюць дапамогу ў шпіталях і аддзяленнях сястрынскага догляду. Дзейнасць у ініцыятыўных групах дае магчымасць змяніць сваё асяроддзе да лепшага. Таму асабліваць такіх груп, як кажуць спецыялісты, у тым, што ў іх няма выразнага падзелу паміж людзьмі, якія аказваюць дапамогу, і тымі, хто яе атрымлівае. Пажылыя людзі становяцца валанцёрамі і дапамагаюць чым могуць тым, хто мае патрэбу, але і самі таксама знаходзяць падтрымку і паляпшаюць

❍ Цытата «Звязды»

«Сапраўднае зло ў старасці — гэта не слабасць цела, а абыякавасць душы. За ценявой лініяй мы бачым людзей і свет такімі, якія яны ёсць, без ілюзій. Стары чалавек задае сабе пытанне: «Навошта?» Гэта, магчыма, самая небяспечная фраза. Аднойчы стары чалавек скажа сабе: «Навошта змагацца? Навошта выходзіць з дому? Навошта ўставаць з ложка?..» ***(Андрэ Маруа)***

сваё жыццё, калі імкнуцца паўплываць на вырашэнне надзённых праблем у сваім горадзе ці мястэчку. Напрыклад, дамагчыся рамонту калодзежаў у сваім населеным пункце, пераносу прыпынку, адкрыцця спартыўных і камп'ютарных класаў для пажылых — усе гэтыя і іншыя ініцыятывы пажылых людзей робяць умовы ў тым ліку і іх жыцця больш спрыяльнымі.

І, дарэчы, валанцёрам Чырвонага Крыжа можа стаць кожны. Для гэтага трэба толькі прайсці спецыяльныя навучальныя курсы, каб быць гатовым аказваць дапамогу.

Валанцёрства спрыяе даўгалецці

Актыўны ўдзел у жыцці грамадства спрыяе здаровому даўгалецці пажылых людзей і павышае якасць іх жыцця — такія вынікі даследаванняў, у прыватнасці рэгіянальнага даследавання «Пашырэнне магчымасцяў пажылых людзей праз актыўны ўдзел у супольнасцях», якое было праведзена ў Беларусі, Босніі і Герцагавіне, Балгарыі.

Таму ў Еўропе, напрыклад Англіі, ёсць такая практыка — накіраванне пажылых людзей пасля лячэння ў шпіталі ў клубы па інтарэсах і г. д., каб паменшыць іх сацыяльную ізаляцыю, павысіць жыццёвы тонус і такім чынам пазітыўна паўплываць на самаадчуванне.

У цэлым актыўны ўдзел пажылых людзей у жыцці прыводзіць да павышэння іх самаацэнкі. У іх з'яўляецца больш знаёмых і сяброў, а аказанне дапамогі іншым дае адчуванне ўласнай запатрабаванасці. Усё гэта вяртае сэнс жыцця. Таму што нярэдка менавіта нерэалізаваныя духоўныя патрэбы з'яўляюцца прычынай страты і здароўя, і сэнсу жыцця. Нездарма ў Біблііі сказана: «Пануры дух сушыць косці». Ужо даўно даказана, што абавязковым складнікам даўгалецця і шчасця з'яўляецца гармонія пяці сфер жыцця: здароўя, зносін, работы, фінансаў і духоўнасці. І калі непаладкі ў першых чатырох сферах мы адчуваем амаль імгненна, то духоўны складнік, на жаль, здольныя адчуць не адразу. Між тым ён важны не менш, а можа, нават і больш за ўсе астатнія.

Святлана БУСЬКО.

Падрабязнасці

ТРАГІЧНЫ АДПАЧЫНАК

На пачатку тыдня з'явілася страшная навіна: у вёсцы Кругавец Жлобінскага раёна знайшлі забітую 45-гадовую жанчыну. Падазраваны ўцёк з месца злачынства, пакінуўшы яе 6-гадовага сына на чыгуначнай станцыі аднаго. Цяпер сталі вядомыя падрабязнасці таго, што адбылося.

У міліцыю Жлобінскага раёна патэлефанаваў дырэктар Пірэвіцкай сярэдняй школы і паведаміў, што ў школе знаходзіцца незнаёмае дзіця без суправаджэння законных прадстаўнікоў. Падчас гутаркі з кіраўніком школы стала вядома, што хлопчыка прывяла жыхарка вёскі Салтанаўка. Тая, у сваю чаргу, расказала, што малога заўважыла касір на чыгуначнай станцыі.

Праваахоўнікі паведамілі, што маці хлопчыка — жыхарка Мурманскай вобласці, набыла дом у вёсцы Кругавец некалькі гадоў таму. Летам жанчына пражывала ў ім разам з трыма непаўналетнімі дзецьмі, аднак гэтым разам старэйшыя дзеці — дачка і сын — з'ехалі з дому, а малодшы застаўся з маці. Па гаспадарцы жанчыне дапамагаў далёкі сваяк — 33-гадовы Слава.

— У дзень забойства паміж пацярпелай і нецвярозым мужчынам паўстаў канфлікт, падчас якога ён спачатку ўдарыў яе, а потым задушыў. З мэтай утойвання злачынства мужчына закапаў цела побач з мяжой дачнага ўчастка. Пасля гэтага са старонкі жанчыны ў сацыяльнай сетцы ад яе імя напісаў дачцэ паведамленне з просьбай нагадаць пін-код ад банкаўскай карткі. Даведаўшыся яго, мужчына зняў частку грашовых сродкаў з банкаўскага рахунку загінулай, — адзначыла **афіцыйны прадстаўнік УСК па Гомельскай вобласці Марыя КРЫВАНОГАВА.**

Нецвярозы забойца сказаў сыну пацярпелай, што яго маці з'ехала ў Мінск. Па версіі следства, праз дзень ён паехаў з дзіцем на чыгуначную станцыю «Салтанаўка», нібы каб сустрэць маму з цягніка. Мужчына загадаў хлопчыку нікуды не сыходзіць і чакаць яго вяртання, а сам з'ехаў на дызель-цягніку ў Гомель.

— Калі я ўбачыла дзіця пасля таго, як Слава яго пакінуў на станцыі, — расказала «Звяздзе» мясцовая жыхарка Алена, — жахнулася: ён быў у брудной майцы ў нейкім шакаладзе, з дранымі калготкамі. Прывезла дадому да сябе, памыла, пакарміла, ўключыла мульцікі.

Калі праваахоўнікі пагаварылі з хлопчыкам, ён паведаміў толькі сваё імя і ўзрост. Тым часам распачаліся пошукі яго маці. Супрацоўнікі Жлобінскага РАУС абследавалі тэрыторыю домаўладання жанчыны і выявілі ўчастак рыхлага грунту, які выдзяляўся з агульнай карціны мясцовасці. На месца здарэння выбыла следча-аператыўная група, эксперты Жлобінскага МРА ДКСЭ, супрацоўнікі УСК і УУС вобласці. Падчас агляду тэрыторыі былі знойдзены прадметы, якія маюць дачыненне да забойства, а разам з тым цела пацярпелай.

Адразу пасля злачынства хлопчык быў змешчаны ў прытулак. Пазней атрымалася выйсці на яго бацьку, які прыехаў па сына ў Беларусь і забраў яго.

Аператыўныя мерапрыемствы Жлобінскага РАУС дапамаглі ў раскрыцці забойства — мужчына быў затрыманы. З яго ўдзелам праведзеныя следчыя дзеянні, у тым ліку праверка паказанняў на месцы здарэння з ужываннем відэазапісу. На падставе сабраных па справе доказаў мужчыну прад'яўлена абвінавачванне па частцы 1 артыкула 139 (забойства) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, што прадугледжвае да 15 гадоў пазбаўлення волі.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Спорт-тайм

АЗАРАНКА І БАРЦІ — У ПАРНЫМ ФІНАЛЕ US OPEN

Вікторыя Азаранка і Эшлі Барці выйшлі ў фінал аднаго з прэстыжных турніраў Вялікага шлема — парнага разраду адкрытага чэмпіянату ЗША па тэнісе.

У паўфінале беларуска і аўстралійка не пакінулі шанцаў яшчэ адной беларусцы Аляксандры Сасновіч і славачцы Вікторыі Кужмавай — 6:0, 6:1. Саперніцы першых фіналістак жаночых пар вызначыліся ўчора ўвечары ў другім паўфінале: Арына Сабаленка і бельгійка Эліз Мертэнс сустракаліся з амерыканскім дуэтам Кэралайн Даўлхайд/Ваня Кінг.

ЯШЧЭ ТРОЕ БЕЛАРУСАЎ ВОЗЬМУЦЬ УДЗЕЛ У МАТЧЫ ЕЎРОПА — ЗША

Тры беларускія спартсмены папоўнілі каманду Еўропы перад лёгкаатлетычным матчам Еўропа — ЗША, які пройдзе 9—10 верасня на Нацыянальным стадыёне «Дынама».

Віталь Парахонька змяніў у складзе зборнай немца Грэгара Трабера ў бегу на 110 м з бар'ерамі. Кацярына Карняенка выйдзе на старт дыстанцыі 3000 м. У бегу на 800 м выступіць Юлія Кароль, якая нядаўна вярнулася ў спорт пасля нараджэння дзіцяці.

Чакаецца, што ўдзел у матчы Еўропа — ЗША возьме каля 350 атлетаў, з іх у зборнай Еўропы выступяць 14 нашых суайчыннікаў. Агульны прызавы фонд складзе 818 тысяч еўра. Пераможца спаборніцтваў у кожнай дысцыпліне атрымае 7 тысяч еўра, сярэбраны прызёр — 5 тысяч, бронзавы — 4 тысячы. Eurovision Sport выкупіў правы на вяшчанне і будзе трансляваць матч па ўсёй Еўропе. Анлайн-трансляцыя будзе весціся на тэлеканалах NBCSN і NBC Sports Gold у ЗША.

МІНСК ПРЫМЕ ЯШЧЭ АДЗІН ЧЭМПІЯНАТ СВЕТУ

Сталіца Беларусі ў 2021 годзе стане гаспадаром яшчэ аднаго буйнога міжнароднага турніру — чэмпіянату свету па сучасным пяціборстве.

Такое рашэнне было прынята ў Будапешце выканаўчым саветам Міжнароднага саюза сучаснага пяціборства. Планетарны форум пяціборцаў пройдзе ў беларускай сталіцы ўпершыню. Раней у 2015 годзе Мінск прымаў фінальны этап Кубка свету, а ў 2017-м паспяхова правёў чэмпіянат Еўропы.

Іван КУПАРВАС.

Прачытаў — перадай другому *Сумесны праект Нацыянальнай бібліятэкі і газеты «Звязда»*

ШТО ТАКОЕ «ВЭТЭРМЕЛЬДУНГ»?

Па якія ваенныя сакрэты можна хадзіць у музей

У партызанскі атрад добраахвотна прыйшоў нямецкі оберфрэйтар войскаў СС, кіроўца асобнай каманды 7А СД Ганзін Эрвін. Ён хацеў расказаць пра тое, як акупацыйныя ўлады спрабавалі схаваць сляды сваіх злачынстваў. Палонных, якіх эксплуатавалі на падобных аперацыях, расстрэльвалі, а ад нямецкіх салдат патрабавалі, каб яны нікому не прагаварыліся аб тым, у чым прымалі ўдзел. Але Эрвін быў упэўнены: такое нельга замоўчваць.

«Восенню 1943 года, падчас адступлення з Раслаўля да Бабруйска, наша каманда спынілася для адпачынку на некалькі тыдняў у вёсцы Лучын, недалёка ад Рагачова. Аднойчы прышоў гаўптшарфюрар Шцёрцынгер да мяне і загадаў падрыхтавацца да «вэтэрмельдунг». Я не меў магчымасці спытаць яго, што азначае гэтае слова....

Мы прыехалі ў прылеглы да горада Рагачова лес. На невялікай прагаліне, да якой прымыкалі могілкі, мы ўбачылі вялікую кучу дроў. Каля яе стаяла многа палонных, якіх ахоўвалі салдаты рагачоўскай групы СД. Гаўптшарфюрар Шцёрцынгер растлумачыў нам значэнне слова «вэтэрмельдунг». Гэта вынайдзены палітычнай паліцыяй псеўданім, за якім хаваецца акт спалення расстраляных у 1941—1943 гадах савецкіх грамадзян... Мы павінны былі ўтварыць вялікае кола, так званую загароду, з тым, каб ніводзін салдат ці мясцовы жыхар не мог назіраць за работай. Палонным загадалі раскапаць магілы. Пасля гэтага трупы выцягвалі і складвалі радамі. На пласт трупаў накладваўся пласт дроў, затым зноў трупы і так да той пары, пакуль не спустошылі тры магілы; там было каля 400 трупаў. Выцягнулі з магіл усіх, аблілі смалой і падпалілі... Мы стаялі ў ахове да таго часу, пакуль не згарэлі ўсе. Попел быў пагружаны ў грузавік і вывезены ў невядомым напрамку». А праз тыдзень гэта ж група зноў паехала ў Рагачоў, але ў іншае месца, недалёка ад лесапілкі. Тут магілы былі значна большыя. У той дзень было спалена больш за 1000 трупаў. «Усё гэта было прыкладна за месяц да выгнання нямецкіх войскаў з Рагачова.

Даследчыкам, якіх цікавіць гісторыя ўласнага краю, перш чым ехаць у Нацыянальную бібліятэку, Нацыянальны архіў ці музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, варта высветліць, якія дакументы яны могуць адшукаць на месцы. Напрыклад, інфармацыю пра выкрыццё сакрэтаў нямецкай «групы зачысткі» я знайшла ў Баранавіцкім краязнаўчым музеі — у газеце «Чырвоная звязда» за 28 красавіка 1943 года. У фондах установы захоўваецца падшыўка гэтага партызанскага выдання (органа Баранавіцкага абласнога камітэта КП(б) Беларусі). Выходзіла газета з красавіка 1943 года тыражом у дзве — дзве з паловай тысячы экзэмпляраў з перыядычнасцю 8—10 разоў на месяц на рускай і беларускай мовах. Усяго ва ўмовах падполля было выдадзена 112 нумароў газеты агульным тыражом больш за 230 тысяч экзэмпляраў. Рэдактарамі былі тады Старавойценка і Будай.

Таксама ў музеі захоўваюцца і іншыя партызанскія газеты, якія ў ваенныя гады выходзілі ў Баранавіцкай вобласці (у той час існаваў іншы адміністрацыйны падзел). Сярод іх выданні Баранавіцкага і Беластоцкага падпольных абкамаў ЛКСМБ «Молодой мститель» і «Молодой партизан», «За Родину» (орган Баранавіцкага гаркама), «Искра» (выдаваў Валожынскі падпольны райкам), «Народный мститель» (Казлоўшчынскі райкам), «Уперад» (Лідскі гаркам-райкам), «Савецкі патрыёт» (Ляхавіцкі райкам), «Смерть фашизму» (Любчанскі), «Сцяг свабоды» (Мірскі) «Звезда» (Навагрудскі райкам), «Вольная праца» (Слонімскі), «Голас селяніна» (Стаўбцоўскі), «Красное знамя» (Шчучынскі) і г. д. Таксама тут можна пабачыць багатую калекцыю ўлётак, выданні, якія трапляліся на гэтую тэрыторыю з Вялікай зямлі, газету-плакат «Раздавім фашысцкую гадзіну», сатырычны лісток «Партызанская дубінка» і рукапісныя партызанскія газеты.

ДВУХНОГІЯ ЗВЯРЫ

Пад такой назвай вышлі ажно дзве паласы ў «Чырвонай звяздзе». Газета друкавала ліст відавочцы: «Сваё ўступленне ў горад Слонім нямецкія акупанты адзначылі масавымі расстрэламі мірнага насельніцтва. Немцы хацелі прымусіць жыхароў горада дэманстраваць сустрэчу гітлераўскай арміі хлебам-соллю. Але людзі, якія не сумелі сысці з горада, забраліся ў падвалы і склепы. Убачыўшы пустынныя вуліцы, гітлераўцы прышлі ў лютасць, яны хадзілі па дварах і расстрэльвалі ўсіх, каго ім удалося знайсці. Яны знішчалі цэлыя сем'і. На маіх вачах былі без усялякай прычыны забітыя сын інжынера Рыбінскага, сям'я рабочага друкарні Поразаўскага і многа іншых»... У артыкуле аўтар называе прозвішчы як ахвяр, так і катаў, якія чынілі забойствы. Ствараючы мясцовае гарадское «самакіраванне», немцы насаджалі ў яго ў першую чаргу сваіх шпіёнаў, а ў дапамогу ім давалі заўзятых крымінальнікаў і антысавецкі элемент... Уся гэта злачынная банда прайдзісветаў па ўказанні гестапа займалася вынішчэннем савецкіх людзей і ў першую чаргу служачых савецкіх устаноў.

Газета распавядае пра пагромы, падчас якіх былі забіты тысячы яўрэяў: «Нямецкія жандармы і паліцэйскія з раніцы да вечара шнарылі па яўрэйскіх кварталах. Дзяцей выкідалі праз вокны, былі выпадкі, калі іх жывымі разрывалі. Усіх яўрэяў сагналі на плошчу да вялікай сінагогі». Пасля «сарціроўкі» адпусцілі тых, хто працаваў у немцаў, астатніх збілі і павезлі на расстрэл. Некаторыя каты выбіралі з натоўпу дзяўчат, абяцаючы іх адпусціць, заводзілі ў кусты, а там гвалцілі і пасля забівалі.

На месцы расправы звар'яцела звыш 50 чалавек. Каля 8 тысяч чалавек было расстраляна... Пасля расправы каты дзялілі маёмасць пакараных. Лепшае немцы забралі сабе, а барахло аддалі сваім халуям.

Пасля знішчэння яўрэяў адбываліся масавыя забойствы беларусаў і палякаў, якія праводзіліся пад выглядам «аблавы на партызанаў». «Нямецкія салдаты, СД і паліцыя ўначы ўрываліся ў кватэры, абрабоўвалі іх, людзей забіралі. Частку з іх адправілі на нямецкую катаргу, другую — расстралялі. «Такая «акцыя на партызанаў» працягвалася немцамі з 12 да 23 снежня 1942 года. Падчас аблавы тысячы людзей былі расстраляныя каля вёскі Петраловічы і зарытыя ў тых жа магілах, у якіх зарывалі яўрэяў 29 ліпеня... У гэты ж час звыш 1200 юнакоў былі схоплены і адпраўлены на катаргу ў Германію...»

Рукапісная газета атрада імя Дзяржынскага.

Такіх жахлівых сведчанняў у партызанскіх газетах, якія беражліва захоўвае Баранавіцкі краязнаўчы музей, безліч. Знаходжу тут звесткі пра масавыя забойствы, лагеры смерці (напрыклад, пра Азарычы), расправы над мірным насельніцтвам у вёсках. «Нямецкія мярзотнікі здзейснілі шэраг новых жахлівых злачынстваў у Баранавіцкай вобласці. Праводзячы карную экспедыцыю на Налібоцкую пушчу, фашысцкія каты абрабавалі, а пасля спалілі сем вёсак Юрацішкаўскага раёна, 26 вёсак Валожынскага раёна, 38 вёсак Івянецкага раёна, — пісала «Чырвоная звязда» 31 жніўня 1943 года. — Яны забілі і замучылі сотні дзяцей, жанчын, старых. Па няпоўных даных толькі ў 17 вёсках, дзе нямецкія каты спраўлялі крывавы баль, забіта і замучана 462 чалавекі. У вёсцы Доры Валожынскага раёна нямецкія звяры забілі 106 чалавек. З іх 26 былі загнаныя ў царкву і зажыва спаленыя».

30 чэрвеня 1944 года, напярэдадні вызвалення Беларусі, газета падвядзе вынікі, што ж акупацыйныя ўлады прынеслі нашай зямлі: «Страшныя даходзілі да нас весткі пра масавыя забойствы людзей, пра спаленне вёсак, разбурэнне гарадоў, пра вынішчэнне ўсёй беларускай культуры. Немцы назвалі Беларусь Мінска-Баранавіцкай акругай, беларусаў — беларутынамі. Яны адмовілі беларусам у праве называцца народам. Знішчалі школы, кнігі... Намеснік Гітлера люты кат Кубэ заявіў з усім уласцівым немцам нахабствам: «Буйныя гарады Беларутэніі — Мінск, Віцебск, Гомель, Магілёў — ператвораны ў руіны. Няма неабходнасці аднаўляць гэтыя гарады, бо горад псуе беларутына, таму што ён прывязаны да зямлі».

Экспазіцыя Баранавіцкага краязнаўчага музея.

«ЖАЛЕЗНЫ ЧАЛАВЕК»

На канферэнцыі, прысвечанай аперацыі «Баграціён», што сёлета праходзіла ў Акадэміі навук Беларусі, гісторыкі параўналі партызанаў з сучасным кіношным нязломным персанажам «Жалезным чалавекам». Сапраўды, падчас Вялікай Айчыннай вайны партызаны наводзілі жах на праціўніка, і публікацыі ў партызанскіх газетах таму пацвярджэнне.

«Без малога два годы зверствуюць нямецкія грабіцелі на беларускай зямлі. Дорага абышліся нямецкім акупантам спробы прыдавіць да зямлі свабодалюбівы беларускі народ. За час вайны народныя мсціцелі Беларусі знішчылі больш 150 тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў.

Дзе-б ні знаходзіўся беларус — на фронце, у партызанскім атрадзе, у тылу, — ён усюды гарыць адным жаданнем: знішчыць ашалеўшае фашысцкае звяр'ё, пазбавіць ад гэтай напасці родную Беларусь, — цытуе прамову народнага паэта Беларусі Якуба Коласа газета «Чырвоная звязда» (правапіс захаваны). — Як і падабае вялікаму і свабодалюбімаму славянскаму народу, беларусы самааддана змагаюцца за сваю свабоду і незалежнасць, за сваю нацыянальную цэласнасць і чэсць... Няхай уся наша зямля — ад Белавежскай пушчы да Прыдняпроўя, ад Брэста да Гомеля, ад Беластока да азёрнай Віцебшчыны — запылае пад нагамі ворага! Да помсты, браты славяне!...»

І зямля сапраўды гарэла — газеты паведамлялі пра ўзарваныя эшалоны і аўтамашыны, разгромленыя гарнізоны. Народныя мсціўцы адцягвалі на сябе ўвагу рэгулярных ваенных часцей. Напрыклад, у красавіку 1943 года адзін з партызанскіх атрадаў на Слонімшчыне вёў бой з буйной нямецкай вайсковай часцю. Немцы ўвялі ў дзеянне супраць партызанаў артылерыю, мінамёты, танкі. Але спроба акупантаў акружыць і знішчыць партызанскі атрад правалілася.

У баявых аперацыях праяўлялі сябе і юныя беларусы. Для моладзі арганізоўваліся заняткі па авалоданні зброяй і вядзенні баявых аперацый. У гэты час і дзяўчаты станавіліся не толькі медсёстрамі, часта хадзілі на «мужчынскія заданні». Знаходжу артыкул пра разведчыцу Аню, якая ўзарвала тры варожыя эшалоны, адну аўтадрызіну, спаліла некалькі мастоў і, выконваючы адно з баявых заданняў, прайшла па тылах ворага 260 кіламетраў. Дзяўчаты-партызанкі Баранавіцкай вобласці пасля агульнага сходу партызанскіх атрадаў у лістападзе 1943 года праз старонкі падпольных газет звярнуліся да сваіх равесніц, заклікалі дапамагаць партызанам, ратавацца ад вывазу ў няволю, дапамагаць бацькам хаваць ад немцаў хлеб і жывёлу.

Часам ворагі, каб скампраметаваць партызанаў, спрабавалі выдаваць за іх сваіх людзей, і газеты папярэджвалі, што марадзёрства, крадзяжы і забойствы — гэта справа рук немцаў і іх агентаў: «Выкрывайце нямецкіх шпіёнаў, паведамляйце пра іх камандаванню партызанскіх атрадаў»; пісалі, што «неабходна ўзмацніць масава-палітычную работу, не дапускаць ніводнага факта няправільных адносін да насельніцтва, сурова караць усіх, хто праяўляе грубасць да насельніцтва, хто кампраметуе званне савецкага партызана»...

Часта газеты друкуюць дзённікі нямецкіх салдат, каб паказаць, як іх «прынялі» на захопленых землях. «Рускія танкі сталі нашым кашмарам. 12-ы дзень яны не даюць нам ні абагрэцца, ні прыйсці ў сябе, ні адчуць сябе хоць на хвіліну зноў людзьмі, а не трусамі, за якімі гоніцца сабака... Рака не стрымала гэтых д'яблаў. Яны неяк пераскочылі яе... Кажуць, застрэліўся обер-лейтэнант Бурш. Што ж, яму можна нават пазайздросціць! Ён ляжыць цяпер спакойна, і яму не сняцца гэтыя рускія браніраваныя д'яблы»... Калі былі надрукаваны гэтыя запісы, ужо былі вызвалены многія населеныя пункты Беларусі. Мясцовыя жыхары выходзілі з сякерамі і рыдлёўкамі рамантаваць дарогі, масты, каб Чырвоная Армія магла хутчэй прасоўвацца наперад... І ў хуткім часе, 30 чэрвеня 1944 года, «Чырвоная звязда» паведаміць: «Зноў сцяг свабоды ўзняты над абласным цэнтрам Беларусі — Віцебскам, над буйным абласным цэнтрам — Магілёвам, над Жлобінам, над Оршай, над Шкловам, Быхавам, Халопенічамі, Клічавым. За адзін толькі ўчарашні дзень войскі Чырвонай Арміі занялі больш за 1150 населеных пунктаў Беларусі!»

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

1287 КОБРЫН

Мы разам — Беларусь!

Краіна моцная рэгіёнамі: Кобрынскі раён

Будні аграрыяў

КАДРЫ, НА ЯКІЯ ВАРТА РАЗЛІЧВАЦЬ

Брэстчына адсвяткавала дажынкі. Завершаны першы этап уборкі ўраджаю. Можна падвесці некаторыя вынікі, абазначыць асобныя кірункі далейшага развіцця аграрнай галіны, крыху зазірнуць у заўтрашні дзень. Гэта мы робім разам са старшынёй Кобрынскага райвыканкама Міхаілам ГРЫШКЕВІЧАМ.

— Вы кіруеце раёнам другі год, Міхаіл Міхайлавіч. Якой вам бачыцца сельская гаспадарка раёна, чаго ўдалося дасягнуць, над чым трэба працаваць?

— Пачнём з таго, што дынамічнае і паступовае развіццё Кобрынскага раёна адчуваецца ва ўсіх сферах народнагаспадарчага комплексу. А сельская гаспадарка з'яўляецца надзвычай важнай галіной у эканоміцы раёна. У сваёй штодзённай рабоце я акцэнтую ўвагу на гэтым кірунку. Прайшла рэарганізацыя шэрагу сельгаспрадпрыемстваў: ААТ «Мінянка» далучылі да «Пакроўскага», ААТ «Кутузаўскі» — да «Любані». Важную ролю, як заўсёды, надаём развіццю матэрыяльна-тэхнічнай базы гаспадарак. Сёння ў раёне вядзецца будаўніцтва буйных малочнатаварных комплексаў ў ААТ «Раданежскае» і ААТ «Батчы». Названае — толькі невялікія штрыхі да вялікай работы, якая праводзіцца ў аграрнай галіне.

Пры гэтым кіраўнікі і спецыялісты займаюцца ўдасканаленнем кармавой базы, сістэмы ўтрымання і кармлення жывёлы, ад якой цалкам залежаць прывагі і надоі. У земляробстве працуем над укараненнем новых відаў раслін з улікам кліматычных асаблівасцяў. І вядома, пры гэтым клапоцімся пра павышэнне заробкаў аграрыяў.

— У гаспадарках раёна завершана ўборка збожжавых і зернебабовых. Якімі асаблівасцямі вызначыўся гэты год, якіх вынікаў дасягнулі земляробы?

— Прырода, як вядома, у гэтым сезоне не раз выпрабоўвала хлебаробаў на трываласць, асабліва анамальнай засухай. Але, нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы, мы атрымалі добры ўраджай збожжа. Сёлетні намалот у засеках раёна без уліку кукурузы, грэчкі, проса большы за леташні на 25 тысяч тон. Самая высокая ўраджайнасць атрымана ў ААТ «Агра-Кобрынскае» — 71,1 цэнтнера з гектара, у ААТ «Пакроўскі» — 45,6. Ды і ў цэлым па раёне ўраджайнасць на чатыры цэнтнеры з гектара перасягнула леташнюю.

Як паказвае аналіз, ключавую ролю ў атрыманні высокіх ураджаяў адыгрывае дыктатура тэхналогіі, якая прадугледжвае высокую культуру земляробства і дысцыпліну кадраў на кожным асобна ўзятым участку. Варта адзначыць, што ў Кобрынскім раёне калектывы цэлага шэрага сельгаспрадпрыемстваў працуюць цікава, плённа і здольныя вытрымліваць напружаную канкурэнцыю. А сёння, напярэдадні раённых дажынак, хочацца выказаць словы вялікай падзякі і хлебаробам, і работнікам перапрацоўчай галіны раёна за руплівую і напружаную працу, за любоў і пашану да роднай зямлі.

— Заўсёды ў кантэксце размовы пра развіццё сельскай гаспадаркі гаворка заходзіць пра кіраўнікоў гаспадарак, якія нясуць асаблівую адказнасць. Што можна сказаць у гэтым кірунку, на кім трымаецца сельская гаспадарка раёна?

— Аўтарытэт кожнага кіраўніка вымяраецца прадпрымальнасцю, своечасовым і эфектыўным пошукам рэзерваў і магчымасцяў, уменнем арганізаваць калектыў на дасягненне пастаўленых задач. Працаваць у гэтым кірунку імкнуцца ўсе нашы кіраўнікі без выключэння. Імі ўзяты курс на ўкараненне высокаэфектыўных тэхналогій у раслінаводстве і жывёлагадоўлі, зніжэнне выдаткаў на вытворчасць прадукцыі, укараненне энергазберагальных тэхналогій. Асновай акрэсленай дзейнасці былі і застаюцца прафесійныя і нацэленыя на вынік кадры. На іх мы ўскладаем вялікія надзеі ў павышэнні эфектыўнасці работы сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

Варта сказаць, што існуе праблема забеспячэння аграпрамысловага комплексу раёна кваліфікаванымі кадрамі. У сельгаспрадпрыемствах раёна апошнім часам стабільна ёсць вакансіі. Над іх запаўненнем працуюць аддзелы кадраў і кіраўнікі.

У гэтым годзе, напрыклад, да работы ў сельгасарганізацыях прыступілі 45 маладых спецыялістаў. Гэта кадры, на якія мы разлічваем і якім дапамагаем замацавацца ў нашых гаспадарках. Спадзяёмся, што яны палюбяць сваю работу. Зямля не церпіць выпадковых людзей — толькі за шчырую адданасць яна шчодра дзякуе багатым ураджаем.

Так трымаць!

ПШАНІЧНЫЯ ЗЕМЛІ

Намеснік дырэктара Пётр ЗНАХАРЧУК аглядае нарыхтаваную падчас жніва салому.

У адкрытым акцыянерным таварыстве «Агра-Кобрынскае» на працягу некалькіх гадоў ладзяцца «Дажынкі». Сёлета таксама не абышлося без свята апошняга снапа. Падчас яго людзі весяліліся, слухалі выступленні самадзейных артыстаў. І, вядома ж, галоўнымі віноўнікамі ўрачыстасцяў былі перадавікі жніва. Іх павіншаваў дырэктар гаспадаркі Сяргей СЕЛІВЕСТРАЎ, уручыў граматы і падарункі.

Агракомплекс «Кобрынскае» па памерах невялікі. Ды працуе гаспадарка эфектыўна ў плане эканомікі, пра што сведчаць вынікі.

— Мы займаемся рапсам, традыцыйна кукурузай на зерне, вырошчваем збожжавыя, гародніну — бульбу, сталовыя буракі, моркву. Асноўная для нас культура — пшаніца, якая добра каласіцца на нашых землях. Нездарма іх называем пшанічнымі, — уводзіць у курс справы Сяргей Дзмітрыевіч. — Сёлета атрымалі самую высокую ўраджайнасць збожжавых у Брэсцкай вобласці — 71,1 цэнтнера з гектара. На працягу дваццаці пяці гадоў традыцыйна мы займаем першыя месцы па ўраджайнасці. Хоць плошчы пад збожжавыя адведзены невялікія — 570 гектараў, тым не менш валавы збор склаў 4053 тоны. Гэта на 1150 тон больш, чым летась. У дзяржаўныя засекі засыпалі 900 тон харчовай пшаніцы трэцяга класа.

Поспеху спрыяе тое, што ў агракомплексе сфарміраваная каманда моцных спецыялістаў, прафесіяналаў сваёй справы. **Галоўны аграном Іван ГУСАК** на гэтай пасадзе больш за 20 гадоў. Можна сказаць, ён віртуоз у сваёй спецыяльнасці. Нездарма двойчы атрымліваў прэмію з рук Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.

Кіраўнік гаспадаркі Сяргей СЕЛІВЕСТРАЎ *(першы справа)*, галоўны аграном Іван ГУСАК гутараць з перадавым механізатарам Сяргеем ЖОЛАХАМ і яго сынам Міхаілам.

— Такіх вынікаў дамагаемся перш за ўсё дзякуючы людзям — механізатарам, хлебаробам, спецыялістам, а таксама — за кошт строгага выхавання тэхналагічных працэсаў, тэрмінаў. У нас няма праблем з набыццём угнаенняў, сродкаў аховы культур. Закупляем іх цалкам пад патрэбы. — кажа Іван Іванавіч. — 71 цэнтнер з гектара для нас — не мяжа. Але гэта эканамічна абгрунтаваная ўраджайнасць. Для таго каб сабраць большы ўраджай, неабходна ўкладваць у яго і больш сродкаў, матэрыяльных рэсурсаў, што пацягне зніжэнне рэнтабельнасці. Зразумела, можна было б вырошчваць іншыя культуры — яравы ячмень, больш сеяць трыцікале. Але за аснову мы бяром эканоміку. У прыватнасці, пшаніцу здаём у большасці трэцім класам, кожная тона прыносіць 380 рублёў. Таму і робім стаўку на гэтую культуру.

Варта адзначыць, што ў гаспадарцы ўсяго тры збожжаўборачныя камбайны КЗС-1218. На адным з іх працаваў дружны сямейны тандэм — бацька і сын — Сяргей і Міхаіл Жолахі. Экіпаж намалаціў 1,6 тысячы збожжа, астатнія крыху менш. Убіралі зерневыя на самых мінімальных хуткасцях, каб не страціць ніводнага зярнятка. І хоць пачыналі ўборку амаль на тыдзень пазней за іншых, закончылі аднымі з першых. І яшчэ дапамаглі на хлебнай ніве суседнім сельгасарганізацыям.

Дадам, што для ўдзельнікаў жніва было наладжана паўнавартаснае двухразовае харчаванне, стравы прывозілі з рэстарана Кобрына. Невялікую частку яго кошту аплачвалі хлебаробы, астатняе кампенсавала гаспадарка.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Алена ДАЎЖАНОК, фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

УНП 200224881.

ЗАХАВАЦЬ І ПРЫМНОЖЫЦЬ НАБЫТКІ

Доўгі час адкрытае акцыянернае таварыства «Пакроўскі» ўзначальваў Віктар Свянцецкі. Віктар Іосіфавіч, мудры і вопытны кіраўнік, шмат зрабіў для развіцця гаспадаркі, пакінуў для прадаўжальнікаў сваёй справы добрую аснову. Цяпер ён працуе на іншай пасадзе, а яго паслядоўнікі захоўваюць і прымнажаюць набыткі.

Такія задачы ставяць у адкрытым акцыянерным таварыстве «Пакроўскі»

Жывая работа для дырэктара

З 1 сакавіка гэтага года «Пакроўскі» ўзначаліў **Яўген НІЧЫНГЕР.** Закончыў Беларускі аграрны тэхнічны ўніверсітэт, працаваў інжынерам-электрыкам у адной з сельгасарганізацый, галоўным энергетыкам на Кобрынскай птушкафабрыцы, ва ўпраўленні сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкама.

— Яўген Ігаравіч, вы ў сельскай гаспадарцы не навічок. І ўсё ж новая пасада, новы калектыў...

— Праблем асаблівых не было. Адрозненне ад ранейшых пасад, відаць, у тым, што тут больш адказнасці за справы, вынікі дзейнасці, за кадры. Давялося спасцігаць нешта новае. Але сказаць, што было вельмі цяжка, не магу. Па параду звяртаўся да сваіх калег — кіраўнікоў іншых гаспадарак — ніколі не адмаўлялі. Дапамагаюць, заўсёды ідуць насустрач і райвыканкам, і ўпраўленне сельскай гаспадаркі, падкажуць, падтрымаюць, — запэўніў Яўген Ігаравіч. — А наогул работа мне падабаецца. Гэта работа жывая — у полі, мехмайстэрнях, на фермах, гэта — пастаянныя зносіны з людзьмі. У кабінеце бываю гадзіну-другую, каб правесці планёрку, падпісаць дакументы, прыняць наведвальнікаў.

Захаванне тэхналогіі і агратэхнікі — святое

А спадчына новаму кіраўніку дасталася немалая. Сёлета збожжавыя каласавыя займалі 2329 гектараў, азімы рапс — 560 гектараў. Іх неабходна было ўбраць своечасова, у сцісłыя тэрміны і без страт. З гэтымі задачамі хлебаробы паспяхова справіліся, абмалацілі ўсё, як кажуць, да апошняга зярнятка. Ураджайнасць склала 45,6 цэнтнера з гектара, што значна вышэй леташняй. Намалацілі каля 10,5 тыс. тон збожжа, рапсу — 1000 тон. Гэтаму паспрыялі ўмовы надвор'я. Але найбольш адказнасць работнікаў і спецыялістаў, захаванне тэхналагічных працэсаў і агратэхнічных тэрмінаў. У гаспадарцы ўжо ўправіліся з сяўбой азімага рапсу. Пасяўныя плошчы гэтай культуры засталіся на ранейшым узроўні. Цяпер у разгары сяўба азімых збожжавых, пад якія адведзена 1800 гектараў. Акцыянернае таварыства займаецца таксама вырошчваннем цукровых буракоў на плошчы 450 гектараў. «Гэта для нас — прыярытэтны кірунак, — падкрэсліў дырэктар. — Прадукцыю здаём на Жабінкаўскі цукровы завод на перапрацоўку. Дзяржзаказ у колькасці 10 300 тон салодкіх караняплодаў выканаем».

Вытворчая нарада. Злева направа: намеснік дырэктара Аляксандр ШАЎЧЭНКА, інжынер па ахове працы Юрый ГОЛУБ, дырэктар гаспадаркі Яўген НІЧЫНГЕР, намеснік дырэктара па жывёлагадоўлі Генадзь НІКІЦЮК, намеснік галоўнага бухгалтара Святлана ХАМУТОЎСКАЯ, інспектар аддзела кадраў Людміла ВАЛАСЮК.

За ўласныя сродкі, без крэдытаў

Генадзь НІКІЦЮК — намеснік дырэктара па жывёлагадоўлі. Менавіта ад яго ў многім залежаць вынікі ў гэтай галіне. А Генадзь Аляксандравіч, як падкрэсліў дырэктар, спецыяліст кваліфікаваны, сапраўдны прафесіянал, які разумее, што без удасканалення, укаранення новых тэхналогій нельга атрымаць вялікае малако. У прыватнасці, на малочнатаварным комплексе «Мінінка», які разлічаны на 765 галоў буйной рагатай жывёлы, ідзе ўладкаванне даільнай залы ў цэху раздою. Асноўныя работы практычна закончаны. Да 1 студзеня 2020 года плануецца ўвесці яе ў дзеянне. Мяркуецца таксама рэканструкцыя памяшкання па вырошчванні цялушак, за ўласныя сродкі, без прыцягнення крэдытаў.

— Вось у гэтым новым будынку, дзе мы знаходзімся, утрымліваецца 640 кароў і яшчэ 200 галоў — у раздойным цэху. Ёсць і старое памяшканне на 340 галоў, дзе прайшла рэканструкцыя, — расказала **загадчыца комплексу Ірына МАРЧУК.** — Для жывёлаводаў створаны належныя бытавыя ўмовы: памяшканні для прыёму ежы з халадзільнікамі, мікрахвалёўкамі, чайнікамі. Ёсць цёплыя туалеты, душавыя. Працаваць таксама тут камфортна. Установлена даільнае абсталяванне нямецкай кампаніі «Вестфалія», тэхналогіі вытрымліваюцца, надоі растуць за кошт правільнага збалансаванага рацыёну — камбікорм, шрот, кармавыя дабаўкі. На тэрыторыі комплексу абсталявана ветэрынарная аптэка, якая забяспечана ўсімі неабходнымі прэпаратамі. На іх кіраўнік грошай не шкадуе. Бо здароўе статка — залог добрых надояў. У сакавіку, калі лічваецца восем энерганасычаных трактароў, пасяўныя агрэгаты, раскідвальнікі. Словам, усё неабходнае для сяўбы, уборкі, апрацоўкі сельгаскультур. Але плануем паціху яго абнаўляць. У некаторых машын выйшаў тэрмін амартызацыі, працаваць на іх немэтазгодна, шмат сродкаў выдаткоўваецца на рамонт, пакупку дэталяў, — адзначае Яўген Нічынгер. — Купляем новую тэхніку, нядаўна набылі праз лізінг самаходны апырсквальнік, паколькі вялікія плошчы адведзены пад рапс — 560 гектараў. Таму гэтая тэхніка нам вельмі спатрэбіцца. Набылі таксама кормараздатчык і кормазмяшальнік для жывёлы.

«Белага золата» стала больш

У гаспадарцы шмат увагі аддаюць развіццю жывёлагадоўлі. Тут функцыянуюць два малочнатаварныя комплексы і дзве малочнатаварныя фермы, налічваецца 1720 дойных кароў. Акрамя таго, на чатырох фермах вырошчваюць маладняк. У параўнанні з перыядам мінулага года павялічыліся надоі малака. Цяпер тут атрымліваюць у сярэднім па 17,81 літра «белага золата» ў суткі ад кожнай рагулі. Малако здаюць на перапрацоўку на Кобрынскі масласырзавод экстра-класам і вышэйшым гатункам, першага практычна няма. Жывёлаводы разумеюць, што іх заробкі залежаць не толькі ад колькасці надоенай прадукцыі, але і ад яе якасці. Таму прымаюць неабходныя захады, каб здаваць усё малако экстра-класам.

Як кажуць, малако ў каровы на языку. Як пакорміш, так і атрымаеш. Таму ў «Пакроўскім» нарыхтоўка кармоў — на першым месцы. Ужо назапашана больш 13,5 тысячы тон сенажу. І на гэтым тут не спыняюцца. Корманарыхтоўка працягваецца. Хутка падаспее кукуруза, якая будзе выкарыстана на сілас. Шмат сенажу закладваюць у палімерныя матэрыялы.

У акцыянерным таварыстве выканалі дзяржзаказ па збожжавых. Астатні ўраджай пакідаюць у сябе або на давальніцкіх умовах завозяць для перапрацоўкі на камбікормавыя заводы, каб забяспечыць гадавую патрэбу грамадскага статку ў кармах. Гаспадарка цалкам забяспечана сіласна-сянажнымі траншэямі. А калі надвор'е сыграе на руку і будзе добры ўраджай кукурузы, пры неабходнасці тут змогуць у сцісłыя тэрміны пабудаваць дадатковыя.

На кукурузных палетках гаспадаркі вырас багаты ўраджай, які папоўніць кармавую базу.

Яўген Ігаравіч заступіў на пасаду дырэктара, у гаспадарцы даілі 11 літраў малака на карову, а цяпер — амаль 18.

— Плануем атрымліваць больш «белага золата», не стаяць на адным месцы. Для гэтага ёсць усе падставы. На новым комплексе працуюць чатыры даяркі, на старым — дзве, у раздойным цэху — адна. Ёсць падменныя, якія даюць выхадныя. Стараемся, каб людзі працавалі па зменах, не перапрацоўвалі. У работніках не маем патрэбы. Ідуць добрае ахвотна, нават маладыя дзяўчаты.

На службе — тэхніка

— Машынна-трактарны парк аснашчаны добрай тэхнікай. На-

Слесар Дзмітрый СТЭЛЬМАШУК у памяшканні, куды паступае прадукцыя малочнатаварнай фермы.

У планах — да будучага жніва абзавесціся яшчэ адным збожжаўборачным камбайнам КЗС-1624. Гэты камбайн добра зарэкамендаваў сябе на нашых палях — за два гады не было сур'ёзных паломак.

Якасць прадукцыі малочнатаварнай фермы пад пільным кантролем лабаранта Алы КЛІМЧУК.

Хуліганаў не трымаюць

— Людзей у нас хапае, усяго ў калектыве налічваецца 225 чалавек, яны самаадданыя працаўнікі, не кідаюць работу на паўдарозе, даводзяць яе да канца, — менавіта так характарызуе кадры Яўген Нічынгер. — Недахопу ў спецыялістах таксама няма. Нядаўна ўзялі новага начальніка гаража. Зарплата ў нас дастойная. І калі ў чалавека ёсць жаданне добра зарабляць, гэта цалкам магчыма. Мы разумеем, што замацаваць кадры можна жыллём. У нас пабудавана шмат дамоў па Дзяржаўнай праграме аднаўлення і развіцця сяла, так званых у народзе «прэзідэнцкіх» домікаў. Тут жывуць не толькі спецыялісты, але і даяркі, механізатары, хлебаробы. Так, па заканадаўстве можна даваць гэтае жыллё і медыкам, і настаўнікам, і работнікам культуры. Але ў першую чаргу забяспечваем ім сваіх работнікаў, каб выключыць цякучасць кадраў. Сёлета ўвядзём у эксплуатацыю яшчэ адзін дом, які пакуль у стадыі будаўніцтва. У гаспадарцы ёсць чарга на паляпшэнне жыллёвых умоў. Адпаведна тут будзе выдзяляцца плошча тым, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Паралельна мы вядзём рамонт старых кватэр. У хуткім часе туды заселяцца дзве сям'і.

Тых, хто працуе абыякава, абы дзень да вечара, выпівох, прагульшчыкаў Яўген Ігаравіч называе хуліганамі. Такіх у гаспадарцы не трымаюць. Кадры карпатліва падбіраюць шляхам конкурснага адбору. Калі на работу просіцца незнаёмы чалавек, з іншай мясцовасці, тэлефануюць на яго ранейшае месца работы, цікавяцца, як ён там сябе зарэкамендаваў. Гультаям — адназначна адмаўляюць. А добрасумленныя работнікі пасля адпаведнага апытання: дзе хочуць працаваць, на якіх умовах, застаюцца. Вядома, у тым выпадку, калі абодва бакі ўсё задавальняе і яны прыходзяць да згоды.

— Мы таксама заключаем дагаворы з вышэйшымі і сярэдне-спецыяльнымі навучальнымі ўстановамі на мэтавую падрыхтоўку маладых спецыялістаў. І пасля навучання яны вяртаюцца да нас. Пакуль пасля абавязковай адпрацоўкі ніхто не сышоў з гаспадаркі. Мы разумеем, калі ў нас будуць моцныя спецыялісты, работнікі, то і гаспадарка будзе развівацца, рухацца наперад. Раскідвацца кадрамі, а затым шукаць годную замену — няма сэнсу.



Перадавы механізатар Фёдар МАРЧУК.

УНП 200227786.

Для таго каб аб'ехаць усе ўладанні адкрытага акцыянернага таварыства «Гарадзец-агра» і дэталёва азнаёміцца з яго дзейнасцю, спатрэбіцца не адзін дзень. Гаспадарка раскінулася ў радыусе 40 кіламетраў і займае ледзь не палову тэрыторыі раёна. Агульная зямельная плошча арганізацыі складае 21 872 гектары, плошча сельгасугоддзяў — 15 465 гектараў, ворыва — 8 657 гектараў, бал сельгасугоддзяў — 29,7, ворыва — 29,9.

Палеткі гаспадаркі на розных берагах Днепра-Бугскага канала злучае паромная пераправа.

УМЕЦЬ ЗАРАБЛЯЦЬ ГРОШЫ, А НЕ ТОЛЬКІ ТРАЦІЦЬ,

вучыць падначаленых дырэктар ААТ «Гарадзец-агра»

Першы намеснік дырэктара Мікалай ВЯРЭНІЧ пазнаёміў нас з перадавікамі вытворчасці, чые партрэты знаходзяцца на Дошцы гонару.

ПЕРАПРАВА: БЕРАГ ЛЕВЫ, БЕРАГ ПРАВЫ

Яшчэ адна асаблівасць або складанасць — гэта з якога боку паглядзець, — тое, што гаспадарку дзеліць на дзве часткі Днепра-Бугскі канал. На супрацьлеглым беразе знаходзіцца былы калгас «Аніскавічы», які далучылі да акцыянернага таварыства некалькі гадоў таму.

— Там налічваецца дзве тысячы гектараў зямлі, дзе сеем збожжавыя, нарыхтоўваем сена, кармы для жывёлы. Тут утрымліваецца і грамадскі статак: дойныя каровы, маладняк на дарошчванне і папаўненне. Усяго — каля паўтары тысячы буйной рагатай жывёлы, — расказвае **першы намеснік дырэктара Мікалай ВЯРЭНІЧ.** — Прынялі мы «Аніскавічы» не ў найлепшым выглядзе, са стратамі, была запушчана зямля, сенажаці. Для паляпшэння ўрадлівасці шмат гадоў уносілі арганіку, праводзілі рэкультывацыю, перазалужэнне траў. Цераз канал наладжана паромная пераправа, па якой дастаўляюцца тэхніка, людзі, кармы для жывёлы. Пераправа працуе падчас навігацыі, а зімой цераз водную артэрыю чыгуначнікі ўладкоўваюць жалезны мост.

Пакуль мы размаўляем, да берага плаўна падыходзіць паром. На ім — некалькі легкавушак, грузавая машына.

— Анатоль Леанюк, — прадстаўляецца кіроўца МАЗа. — Працую ў гаспадарцы даўно. Мяне ўсё задавальняе. У тым ліку і зарплата, яна дастойная і выплачваецца без затрымак.

Анатоль Маркавіч цяпер займаецца адвозкай кармоў на ферму.

— А не страшна снаваць на пароме? — цікавімся ў яго.

— Ды не, зусім не страшна, мы ж ведаем, як сябе паводзіць, захоўваць тэхніку бяспекі, бо праходзім інструктаж.

ЖЫЦЬ І РАЗВІВАЦЦА ЗА СВАЕ СРОДКІ

Вядома, людзі помняць, што не заўсёды былі такія часы, калі гаспадарка шпарка развівалася, ішла наперад. Перамены да лепшага звязваюць з дырэктарам Іванам Цецеруком, які пятнаццаць гадоў таму ўзначаліў ААТ «Гарадзец-агра», былы калгас-камбінат імя Дзяржынскага. На той час у яго склад уваходзілі чатыры некалі самастойныя арганізацыі, затым далучылі яшчэ дзве стратныя. Грошай на закупку тэхнікі, угнаенняў, сродкаў аховы раслін катастрафічна не хапала. Але кіраўніцтва не лезла ў пазыкі. Пачалі актыўна карыстацца лізінгам на закупку тэхнікі. Паралельна пераводзілі фермы на новыя тэхналогіі. Стаўку зрабілі не толькі на малочную, але і на мясную вытворчасць. Паўстала пытанне зніжэння затрат, без чаго немагчыма было эфектыўна працаваць. Іван Сяргеевіч пастаянна нагадваў падначаленым даўнюю мудрасць: трэба жыць і развівацца за свае сродкі, не пазычаць у дзяржавы або ў суседа. А яшчэ паўтараў, што грошы неабходна ўмець не толькі зарабляць, але і траціць з розумам.

Іван Цецярук свой, мясцовы, нарадзіўся ў вёсцы Павіцце Кобрынскага раёна. Усё жыццё працаваў у сельскай гаспадарцы, узначальваў ААТ «Дружба», якое за некалькі гадоў вывеў, як кажуць, у людзі, паставіў на ногі.

Іван Сяргеевіч — патрабавальны кіраўнік, але разам з тым і паважлівы да сваіх падначаленых. Не адмовіш яму і ў тым, што ён умее працаваць з кадрамі. У гаспадарцы выпрацавана дакладная сістэма падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, пачынаючы са школьнай лаўкі.

— У гаспадарцы я працую ўжо сорак гадоў і ўвесь гэты час, колькі помню, мы кантактуем з Гарадзецкай і Акцябрскай школамі. Гэтую традыцыю падтрымаў і прадоўжыў Іван Сяргеевіч, — кажа Мікалай Вярэніч. — Не ўсе выпускнікі пасля вучобы ў вышэйшых і спецыяльных навучальных установах абавязкова застануцца ў гаспадарцы, але хтосьці звяжа свой лёс з малой радзімай. І ўжо гэта выдатна.

А найлепшым вучням установ адукацыі адміністрацыя выплачвае грашовыя прэміі, якія ўручаюцца ва ўрачыстай абстаноўцы на школьных лінейках. Гэта стымулюе іх да выдатнай вучобы, а ў далейшым, магчыма, і да работы ў гаспадарцы.

Разам з тым партрэты перадавікоў таварыства змешчаны не толькі на Дошцы гонару на цэнтральнай сядзібе, але і на стэндзе ў комплексе дзіцячы сад—сярэдняя школа. Так захоўваецца пераемнасць пакаленняў.

Збожжасушыльная ўстаноўка — высокатэхналагічнае звяно сучаснай гаспадаркі.

Нашы перадавікі

ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯ

Аператары машыннага даення:

малочнатаварная ферма «Мяфёдавічы»:

Антаніна Васілеўна Псышчаніца, надой на карову 3445 літраў (плюс 757 літраў да ўзроўню 2018 года).

Людміла Якаўлеўна Сітанасіцкая, 3074 літры (плюс 212 літраў да ўзроўню 2018 года).

Малочнатаварная ферма «Акцябр»:

Надзея Рыгораўна Ліштван, 3326 літраў.

Алена Васілеўна Дзенісюк, 3022 літры.

Цялятніца **МТФ «Кустовічы»:**

Наталля Канстанцінаўна Аляксеева, сярэднясутачная прывага 884 грамы (плюс 41 грам да ўзроўню 2018 года).

Аператары па адкорме буйной рагатай жывёлы:

Павел Паўлавіч Астапук, 955 грамаў (плюс 90 грамаў да ўзроўню 2018 года).

Кіроўцы аўтамабіляў:

Валерый Якаўлевіч Кугач, на аўтамабілі МАЗ пройдзена з грузам 217,2 тысячы т/км (плюс 60,7 тысячы т/км да ўзроўню 2018 года).

Уладзімір Анатолевіч Леанюк, на аўтамабілі перавезена збожжавых, зернебабовых, рапсу 2326 тон (плюс 256 тон да ўзроўню 2018 года).

Трактарысты-машыністы:

Аляксандр Рыгоравіч Таргун, на збожжаўборачным камбайне КЗС-1218 намалаціў 1353 тоны зерня (плюс 1201 тона да ўзроўню 2018 года).

Мікалай Васілевіч Аляксееў, на трактары МТЗ-82 на прасаванні сена и саломы ўбраў 1293 тоны (плюс 499 тон да ўзроўню 2018 года).

Сяргей Уладзіміравіч Заноўскі, на трактары John Deere на падрыхтоўцы глебы і сяўбе выпрацоўка склала 2303 умоўныя эталон-гектары (плюс 416 умоўных эталон-гектараў да ўзроўню 2018 года).

Леў Міхайлавіч Цімашук, на трактары John Deere працаваў на падрыхтоўцы глебы да сяўбы, выпрацоўка склала 3139 умоўных эталон-гектараў (плюс 780 умоўных эталон-гектараў да ўзроўню 2018 года).

Марына ЗЫЛЬ — адна з найлепшых аператараў малочнатаварнага комплексу.

У ПЕРСПЕКТЫВЕ — ПАВЫСІЦЬ НАДОІ І ПРЫВАГІ

Асноўнай дзейнасцю ААТ «Гарадзец-агра» з'яўляецца вытворчасць мяса і малака. У раслінаводстве таварыства спецыялізуецца на вырошчванні збожжавых культур, цукровых буракоў і кармоў.

У гаспадарцы налічваецца шэсць вытворчых участкаў у раслінаводстве, комплекс па дарошчванні і адкорме буйной рагатай жывёлы на 6060 галоў, трынаццаць малочнатаварных фермаў, дзе ўтрымліваецца больш за 13 000 галоў жывёлы, у тым ліку 3654 каровы. За студзень—ліпень гэтага года надоена 10 283 тоны малака, ад кожнай каровы атрымана яго ў сярэднім 2808 кілаграмаў, што склала 105,8 % да ўзроўню мінулага года, дзяржаве прададзена 9 388 тон малака — 100,4 % да леташняга ўзроўню. З кожным годам павышаецца таварнасць малака, цяпер яна складае 91,2 %.

Сярэднясутачная прывага буйной рагатай жывёлы — 815 грамаў, гэта 108,8 % да ўзроўню мінулага года. Прывагі самыя высокія ў раёне. Пры гэтым, як сцвярджаюць спецыялісты, кармоў расходуецца менш, чым у іншых гаспадарках. У «Гарадзец-агра» бяруць якасцю кармоў, збалансаванасцю рацыёну, што дасягаецца за кошт пасеваў канюшыны, люцэрны, іншых багатых бялком культур.

— Наша найбліжэйшая перспектыва — павялічыць надоі, асабліва на фермах далучаных гаспадарак. Спачатку яны паўплывалі на зніжэнне агульных вынікаў. Але цяпер справы выраўноўваюцца — наладжваецца племянная работа, робіцца запас кармоў, з тым каб у неўраджайныя гады мы маглі ўдосталь карміць жывёлу, а значыць, павышаць надоі і прывагі, — падкрэслівае Мікалай Вярэніч.

У гаспадарцы і ў далейшым маюць намер прыбаўляць пагалоўе жывёлы. Таму тут пастаянна вядзецца рэканструкцыя на фермах, будуюцца новыя памяшканні, клюшачнікі, кароўнікі, прычым за асабістыя сродкі. Гэтая работа будзе працягвацца.

У савецкія часы, недзе ў канцы 1970-х гадоў, на тэрыторыі сельгасарганізацыі пачалі ўзводзіць камбікормавы завод, які б не толькі абслугоўваў комплекс па адкорме і дарошчванні маладняку на 10 тысяч галоў, але і працаваў на патрэбы ўсяго раёна. Аднак яго так і не дабудавалі. Гэты васьміпавярховы гмах на працягу часу прыходзіў у нягоднасць, ствараў небяспеку для людзей. Нядаўна яго ўзарвалі работнікі МЧС, для чаго давялося ўжыць спецыяльныя тэхналогіі.

— Спачатку, сапраўды, комплекс быў разлічаны на дзесяць тысяч галоў жывёлы, столькі яе тут і стаяла. Цяпер налічваецца больш шасці тысяч. На комплексе прайшлі рэканструкцыя і капітальны рамонт. У сувязі са значным падаражаннем электраэнергіі і матэрыяльных рэсурсаў кармы пачалі раздаваць трактарамі, што станоўча паўплывала на сабекошт прадукцыі, — кажа Мікалай Вярэніч.

Дарэчы, комплекс «Гарадзец» — найбуйнейшы ў вобласці, а ў Беларусі іх разам з нашым налічваецца ўсяго чатыры. Іншыя знаходзяцца ў саўгасе-камбінаце «Мір» Баранавіцкага, ААТ «Астрамечава» Брэсцкага і СВК «Фядорскі» Столінскага раёнаў.

У «Гарадзец-агра» сёлета ўраджайнасць збожжавых склала 34,5 цэнтнера з гектара. Для такіх зямель, як тут, гэта нядрэнна, лічаць у сельгасарганізацыі. Хлебаробы ў першую чаргу выканалі дзяржзаказ, астатняе засталося на корм жывёле. Збожжа сушыцца, даводзіцца да кандыцыі на КЗС-30, які набылі больш за дзесяць гадоў таму, працуе на газе.

Абслугоўваюць гэтую вялікую гаспадарку шэсць трактарных брыгад, шэсць майстэрняў і дзве брыгады па рамонце абсталявання фермаў.

Машынна-трактарны парк таксама пастаянна абнаўляецца. Нядаўна закупілі чатыры аўтамабілі МАЗ грузападымальнасцю 20 тон, агрэгат «Страказа» для хімізацыі захватам 24 метры, тры новыя збожжаўборачныя камбайны вытворчасці «Гомсельмаша», камбайн для ўборкі буракоў.

Прасторныя, светлыя памяшканні для буйной рагатай жывёлы, стракатыя кветнікі вакол — такім вы бачыце на гэтых фота малочнатаварны комплекс.

Лабарант Кацярына ВАЛАСЮК.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА. УНП 200224866.

Так трымаць

САМАБЫТНАСЦЬ, СТАБІЛЬНАСЦЬ, СІСТЭМНАСЦЬ

У «СТРЫГАВЕ» ЛЮБЯЦЬ ПАРАДАК ВА ЎСІМ

Адкрытае акцыянернае таварыства «Стрыгава» — гаспадарка самабытная. Яркай старонкай у яе гісторыі быў доўгі час, калі кіраўніком працаваў Уладзімір Кузіч. Пры ім гаспадарка зазнала сур'ёзны пад'ём і росквіт: дабівалася значных паказчыкаў і пры Савецкім Саюзе, і пры незалежнай Беларусі. Пасля Уладзіміра Рыгоравіча эстафету прыняў Ігар Масько, які прымножыў набыткі свайго папярэдніка.

Стымул працаваць лепш

На сённяшні дзень гаспадарка павялічыла выпуск валавой прадукцыі. Ён склаў 126 % да ўзроўню мінулага года, каля 127 % — у жывёлагадоўлі, якая дае асноўную частку прыбытку. Штодзень тут здаюць каля 23 тон малака на Кобрынскі масласырзавод. Вельмі сур'ёзна працуюць над павышэннем якасці малака. У акцыянерным таварыстве распрацавалі меры матэрыяльнага стымулявання супрацоўнікаў. За дадатковае малако налічваюцца прэміяльныя. У аператараў машыннага даення, слесараў, жывёлаводаў, якія абслугоўваюць дойны статак, з'явілася непасрэдная зацікаўленасць. Не забылі і загадчыкаў фермаў, ветурача, тэхнолага, якія непасрэдна ўдзельнічаюць у тэхналагічных працэсах. На сённяшні момант гаспадарка прадае 100 % малака экстра-класа. Звычайна ж гэты паказчык складае ад 65 да 75 % у месяц. На цяперашні дзень па малаку сітуацыя нядрэнная — каля 3,5 літра на карову, больш чым у адпаведны перыяд мінулага года.

— На той момант, калі я прыйшоў на пасаду намесніка дырэктара ў студзені гэтага года, сур'ёзнымі праблемамі былі захворванні канечнасцяў у жывёлы, а таксама мастыты, — канстатуе Дзмітрый Місюк. — Праведзена калясальная работа па лячэнні жывёлы. Летась таварнасць малака ў сярэднім складала 85 %, то па выніках работы за студзень—чэрвень гэтага года — 89,6 %. А цяпер яна на ўзроўні 96—98 %. І далейшы яе рост цалкам рэальны: распрацаваны найбольш аптымальныя схемы выпойвання цялят, якія даюць магчымасць захоўваць маладняк, атрымліваць максімальныя прывагі і таварнае малако.

Сёлета ў гаспадарцы ўведзена ў эксплуатацыю новая ўстаноўка для вытворчасці патакі з размолатай сумесі збожжавых культур. Гэтае прыстасаванне забяспечвае каштоўнай дабаўкай увесь статак буйнай рагатай жывёлы.

Піянер у рэканструкцыі фермаў

— Гаспадарка сапраўды трымае марку па паказчыках у раслінаводстве, жывёлагадоўлі. І штогод назіраюцца тэндэнцыі росту. Вядома, не абыходзіцца і без праблем. Да «Стрыгава» далучылі сельгаспрадпрыемства «Тэўлі». На паперы паказчыкі знізіліся, таму што фінансавыя абавязкі па пагашэнні крэдыторскай запазычанасці мы ўзялі на сябе. Калі надоі на карову былі большыя за шэсць тысяч літраў малака ў год, то цяпер знізіліся. І гэта зразумела: грамадскі статак разбавіўся нізкапрадукцыйным пагалоўем. Калі ж браць у разрэзе комплексаў і малочнатаварных фермаў, то ранейшыя паказчыкі вытрымліваюцца, — расказаў **намеснік дырэктара Дзмітрый МІСЮК.** — Акцыянернае таварыства стала піянерам у раёне па рэканструкцыі малочнатаварных фермаў. Прычым за кошт уласных сродкаў, без прыцягнення крэдытных рэсурсаў.

На сёння ў «Стрыгаве» налічваецца 5156 гектараў сельгасугоддзяў, у тым ліку 3413 гектараў ворыва, утрымліваецца 4238 галоў буйной рагатай жывёлы, сярод іх — 1450 дойнага статка. У гаспадарцы ёсць тры вялікія мадэрнізаваныя малочнатаварныя фермы і адна невялікая — на 200 галоў. Гэта адзіная ферма, дзе наладжаны выпас жывёлы. Астатнія працуюць па інтэнсіўным тыпе, інакш кажучы, кармленне адбываецца ў памяшканні. У жывёлагадоўлі наладжаны закрыты цыкл папаўнення статка — ад вырошчвання маладняку да каровы.

Жывёла любіць стабільны догляд

Шмат зроблена па гінекалагічным лячэнні жывёлы. У параўнанні з мінулым годам, гаспадарка стабільна плюсуе па ўзнаўленні, пакрыцці кароў, знізілася выбракоўка жывёлы ў цэлым па статку. Практычна адышлі праблемы з капытамі — вясной і восенню іх абрэзалі. Праводзіцца бягучае лячэнне, а для прафілактыкі ўладкавалі спецыяльныя ёмістасці з дэзынфікуючымі сродкамі.

— Асноўныя прычыны выбракоўкі на комплексах — мастыт і захворванні капытоў. Мы праблему знялі. Але ёсць такое слова «руціна», характэрнае для жывёлагадоўлі: руцінная работа. Карова любіць стабільнасць у доглядзе: своечасовае і якаснае кармленне, вакцынацыя, апрацоўка. Усё павінна ісці роўна, па схеме, што дазваляе атрымліваць вынікі штодзень. І, вядома, дамагчыся іх немагчыма было б без спецыялістаў. Нядаўна ў нас пачаў працаваць новы заатэхнік Канстанцін Аршынскі — прафесіянал найвышэйшага класа. Канстанцін Аляксандравіч пераехаў з сям'ёй з Гомельскай вобласці. Жонка ўзначальвае малочнатаварны комплекс, таксама выдатны спецыяліст. Апошнім часам зрабілі ратацыю кадраў, замянілі загадчыкаў фермаў.

Праўда, адчуваецца пэўны дэфіцыт ветэрынарных кадраў, зрэшты, як і ў цэлым па краіне. Гэта звязана з тым, што важнасць работы тэхнолагаў у гаспадарках не заўсёды аб'ектыўна ацэньваюць. Больш цэняць тых, хто працуе рукамі, колькі надоіць малака, намалоціць збожжа. Але тэхналогіі — гэта разумовая праца, у выніку якой павышаюцца надоі, прывагі, ураджайнасць. Разам з тым гэтыя спецыялісты атрымліваюць значна меншую зарплату, чым даяркі, механізатары. Таму і сыходзяць на больш «хлебную» работу. Нам таксама патрэбны ветэрынарны ўрач. Ёсць дамоўленасць з маладым чалавекам, які пасля службы ў арміі восенню прыйдзе да нас працаваць. Цяпер абавязкі галоўнага ветурача выконвае Вольга Міхайлаўна Чабатарова. На комплексе таксама ёсць ветэрынарны фельчар Дзіма Пашковіч. Актыўна стымулюем, каб ён працягваў вучобу ў вышэйшай навучальнай установе, — кажа Дзмітрый Місюк.

Вельмі нядрэнна ў «Стрыгаве» спрацавалі па прывагах жывёлы, па гаспадарцы ў цэлым яны складаюць 600 грамаў і больш. Калі браць у разрэзе фермаў, то ў сярэднім мінімальныя — 696 грамаў, максімальныя — 1093 грамы.

Як пакорміш, так і атрымаеш

— Працуем мы па інтэнсіўных тэхналогіях, адмовіліся ад такіх методык, як размол зерня. Шчыльна кантактуем з Жабінкаўскім камбікормавым заводам, таварыствам з абмежаванай адказнасцю «Консул». Гэтая кампанія выпускае на пляцоўцы завода па сваёй рэцэптуры камбікармы. Тут пачалі выкарыстоўваць вельмі цікавы новы камбікорм ККК-605. У яго прымальны сабекошт, калі звычайны каштуе каля 1000 рублёў за тону, то гэты 1600, паколькі ідзе як канцэнтрат: напалову змешваецца з зернем кукурузы. Гэты корм збалансаваны па бялку. Урэшце ён абыходзіцца па 800 рублёў за тону. І вынік ужо бачны па прывазе жывёлы, — падзяліўся Дзмітрый Місюк.

У гаспадарцы ўспомнілі старую добрую тэхналогію — атрыманне зерневай патакі, якую ўкараняюць першымі ў раёне. Зерне мелецца, у біярэактары яно паспявае пры дапамозе ферментных прэпаратаў, расчапляецца да прасцейшых полі-цукрыдаў, і фактычна рацыён насычаецца цукрамі. Пасля таго як пачалі выкарыстоўваць гэты метад, надой ад каровы павялічыўся на 500 грамаў. Толькі за кошт таго, што пайшла балансіроўка паміж цукрамі і пратэінам.

Разам з тым ёсць і пытанні, якія неабходна вырашаць. У «Стрыгаве» сутыкнуліся з недахопам плошчаў, назіраецца скучанасць жывёлы. Пагалоўе буйной рагатай жывёлы можна давесці і да пяці тысяч. Для гэтага неабходна будаваць новыя памяшканні. На ферме Мацы ўжо пачалі ўзводзіць прафілакторый для малых цялят на 500 галоў, а таксама памяшканне для ўтрымання рамонтных цялушак 12—18 месячнага ўзросту. Вядома, ёсць пэўныя фінансавыя цяжкасці па будаўніцтве. Але ў гаспадарцы шукаюць і пралічваюць варыянты, як найлепш выйсці з сітуацыі.

Загадчыца малочнатаварнай фермы «Стрыгава» Таццяна РОШЧЫНА.

Прапрацоўваюцца таксама пытанні па закупцы або арэндзе агрэгата па плюшчэнні зерня, атрыманні патакі, паколькі ў таварыстве займаюцца ў тым ліку і буракамі.

Сёлета пасеяны вялікі аб'ём кукурузы — звыш тысячы гектараў. У планах — забяспечыць больш як гадавы запас сіласу, нарыхтавалі 12 тысяч тон сенажу, усяго ж плануецца назапасіць яго каля 15 тысяч. Вымалёўваецца добрая карціна па сіласе — багата ўрадзіла кукуруза, плануецца атрымаць як мінімум 25 000—30 000 тон. Гэта дасць магчымасць забяспечыць каля 35 цэнтнераў кармавых адзінак на ўмоўную галаву жывёлы. Так што перспектывы нядрэнныя — жывёлагадоўля будзе з кармамі, а гэта — умовы далейшага росту аб'ёму прадукцыі.

У сельгасарганізацыі распрацавалі сістэму па гігіене даення, падабралі аптымальныя прэпараты, якія даюць магчымасць прафілактыкі захворванняў. На сённяшні дзень пастаўлена задача знізіць сабекошт малака ў выніку максімальнага выкарыстання травяністых кармоў з высокім утрыманнем бялку.

Кармавой базе ў «Стрыгаве» надаюць вялікую ўвагу, кармы закладваюцца толькі з кансервантамі высокай якасці, няма ніякіх пытанняў па наяўнасці арганічных кіслот, бялку. А нарыхтоўку вядуць у аптымальныя фазы паспявання траў, выкарыстоўваюць трохслойную сістэму закрыцця.

— Мы разумеем, што кармы — гэта прыярытэт, — кажа мой суразмоўнік, — пабудавалі дзве новыя траншэі сумарнай магутнасцю 5000 тон, плануецца ўзвесці яшчэ адну на 2,5—3 тысячы тон. Актыўна вядзём работу па абнаўленні пасеваў траў, закупцы травяных сумесяў з высокім утрыманнем бялку. На сёння пасеяны каля 90 гектараў канюшыны. Традыцыйна таксама займаемся люцэрнай. З улікам таго, што ў нас добрыя землі — 32—36 балаў, вырошчваем збожжавыя, нядрэнныя ўраджаі дае пшаніца. Вялікі аб'ём яе пастаўляецца ў лік дзяржаўнага рэзерву. Акцэнтуем таксама ўвагу на вытворчасці фуражнага збожжа, супрацоўнічаем з іванаўскім «Белсоладам» па пастаўках піваварнага ячменю. Сеем і рапс, калі летась намалацілі яго 300 тон, то сёлета — 1200. Асобныя плошчы давалі да 50 цэнтнераў з гектара.

Такая сучасная тэхніка выкарыстоўваецца для раздачы кармоў жывёле.

У гэтай новай траншэі будзе захоўвацца 3000 тон сіласу.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

УНП 200040784.

КУДЫ РУХАЦЦА І ЯК РАЗВІВАЦЦА

ВЕДАЮЦЬ У ТАА «КАНТРЫ-МІЛК»

Быць кіраўніком — гэта не толькі пачэсна, але і вельмі адказна. Тым больш калі гэта сельскагаспадарчае прадпрыемства, а ты — жанчына. Людміла ВОЛАХАВА на пасадзе дырэктара акцыянернага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Кантры-Мілк» чатыры гады. Спадчына ёй дасталася незайздросная, шмат было праблем. Але за той час, што стаіць ля штурвала гаспадаркі, яна змагла стабілізаваць сітуацыю, значна павысіць вытворчыя паказчыкі, з'яднаць калектыў, сабраць выдатных спецыялістаў-аднадумцаў. «Людміла Аляксандраўна валодае дарам пераканання, літаральна фантануе новымі ідэямі», — кажуць пра яе падначаленыя.

— Наша гаспадарка невялікая, займаецца вытворчасцю малака. Тут налічваецца 2998 гектараў зямлі, 1988 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 910 дойных кароў, працуе 122 чалавекі. Адкорм і мясны кірунак у нас адсутнічаюць, — уводзіць у курс справы Людміла Волахава. — Зямлі хапае, каб забяспечыць жывёлу якаснымі кармамі і закрыць дзяржзаказ. Летась у дзяржаўныя засекі пастаўлялі піваварны ячмень і пшаніцу. Сёлета адгрузілі толькі ячмень. Ураджайнасць збожжавых і зернебабовых 36,7 цэнтнера з гектара. Таксама сёлета добра ўрадзіў рапс — 36,5 цэнтнера.

«Кантры-Мілк» у сучасным выглядзе існуе пяць гадоў: у 2014-м да таварыства далучылі сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Вербнае» шляхам рэарганізацыі. Поспехі тут былі далёка не зорныя. Неабходна было наладжваць культуру земляробства, кардынальна мяняць тэхналогіі ў жывёлагадоўлі.

— Малако мы здаём на Кобрынскі масласырзавод — штодзень 14,5-15 тон. Цяпер у сярэднім доім па 17,6 літра на адну фуражную карову. За сем месяцаў прадалі прадукцыі экстра-класа 92,3 працэнта. Астатняе пайшло вышэйшым гатункам. За гэты ж перыяд таварнасць малака склала 92,9 працэнта. Ніжэй за гэты ўзровень імкнёмся не апускацца, — канстатуе мая суразмоўніца.

— Каровы ў нас на стойлавым утрыманні круглы год, мы не выкарыстоўваем прыкорм зялёнай масай. Менавіта гэтымі тэхналогіямі і адрозніваемся ад іншых гаспадарак, — уступае ў размову **начальнік аддзела жывёлагадоўлі — галоўны ветурач Алег МЛЕЧКА.** — Даём рагулям толькі канцэнтраваныя кармы: сілас, сянаж. Гэта даражэй, але таго варта. Тып харчавання не мяняецца ў залежнасці ад умоў надвор'я, іншых прычын, бо кармы закансерваваныя. А гэта ўплывае на здароўе кароў, гатунковасць малака.

Штогод у таварыстве надоі малака растуць прыблізна на 2,5 літра ад каровы. І ў планах кожны год прыбаўляць да трох літраў. Напачатку ў гаспадарцы атрымлівалі ад кожнай жывёліны ўсяго восем літраў. І гэта зразумела: на адну карову даводзілася 17 цэнтнераў кармавых адзінак. Цяпер жа забяспечанасць складае больш за 43 цэнтнеры.

— У жывёлагадоўлі нам ёсць куды расці, развівацца і рухацца наперад. Перш за ўсё неабходна паляпшаць умовы ўтрымання кароў. А для гэтага правадзіць рэканструкцыю і мадэрнізацыю комплексу будынкаў, уладкаваць новы даільна-малочны блок. Гэта дарагое задавальненне, а разлічваць даводзіцца толькі на асабістыя сілы. Таму рамантуем будынкі гаспадарчым спосабам, паціху, пакрыху, — кажа Алег Млечка.

Што датычыцца земляробства, то сёння тут таксама адбываюцца змены да лепшага, шмат цікавага: і культуры, і гібрыды, і сарты новыя. Словам, поле дзейнасці шырокае. У гаспадаркі абнаўляюць машынна-трактарны парк. Сёлета купілі новы культыватар, будуць укараняць прапашную тэхналогію глыбокага рыхлення. Летась у лізінг узялі камбайн.

Заатэхнік-селекцыянер Дзмітрый КАЗАК у памяшканні для буйной рагатай жывёлы.

Начальнік аддзела жывёлагадоўлі — галоўны ветурач Алег МЛЕЧКА задаволены якасцю назапашанага для статка корму.

— А ўсяго прадугледжваецца набыць каля 13 адзінак новай тэхнікі па праграме Аграпрамлізінгу на 1 мільён 200 тысяч рублёў. Паступова выплачваем першапачатковыя ўзносы, — канстатуе Людміла Волахава.

Што датычыцца зарплаты, то яна дастойная — сярэдняя больш за 900 рублёў. Да ўзроўню мінулага года вырасла на 40 %.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

УНП 291332787.

ЗАРАБЛЯЦЬ І ТРАЦІЦЬ З КАРЫСЦЮ

Паміж Кобрынскім райкамам прафсаюза аграпрамысловага комплексу і ўпраўленнем сельскай гаспадаркі і харчавання падпісана пагадненне. Сацыяльныя партнёры разам вырашаюць шырокі спектр пытанняў. Гэта і стварэнне для сельскіх працаўнікоў належных і бяспечных умоў працы і быту, арганізацыі культурнага адпачынку. Але, бадай, самая галоўная роля прафсаюза — абарона правоў і законных інтарэсаў тых, хто працуе на сяле. Шмат увагі аддаецца і маладым спецыялістам, работнікам.

— Мы разумеем, што пакуль для моладзі не будуць створаны ўмовы, максімальна набліжаныя да гарадскіх, да таго часу на вёсцы будзе адчувацца дэфіцыт кадраў. Бо анкетаванне паказвае: маладым акрамя дастойнай зарплаты, патрэбны належны адпачынак, сацыяльныя і забаўляльныя, культурныя аб'екты, каб грошы можна было не толькі зарабляць, але і з карысцю іх траціць, — кажа **старшыня райкама прафсаюза АПК Васіль ЛАЗАРЧУК.**

І, вядома, не забываюць у раёне ўшаноўваць найлепшых працаўнікоў. Сёлета падчас жніва райкам прафсаюза ўзнагародзіў дваццаць чалавек. У асноўным уручалі сертыфікаты. І гэта апраўдана: кожны зможа набыць у краме тое, што лічыць неабходным для дома, гаспадаркі.

Дадам, што ў раёне разам з рознымі службамі, падраздзяленнямі аддаецца шмат увагі ахове працы. І, як вынік, агульнымі сіламі ўдалося выключыць траўматызм у сельскай вытворчасці.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Сын малой радзімы

Уладкоўваць родную вёску Лелікава Іван Панасюк пачаў задоўга да таго, як у нашай краіне прагучаў заклік зрабіць унёсак у паляпшэнне родных гарадоў і вёсак. У 2006 годзе да 460-годдзя Лелікава расійскі бізнесмен і мецэнат пабудаваў тут сучасны тэнісны корт. Тады на адкрыцці аб'екта ён гаварыў, што хоча зрабіць гэты від спорту даступным для вясковых дзяцей. Займацца тут можна бясплатна, а корт адпавядае ўсім міжнародным стандартам, любыя спаборніцтвы можна праводзіць у Лелікаве. Пра гэта заявілі запрошаныя эксперты — вядомыя беларускія тэнісісты Уладзімір Ваўчкоў, Вольга Барабаншчыкава, прадстаўнікі Беларускай асацыяцыі тэніса.

Цяпер корт актыўна выкарыстоўваецца маладым пакаленнем вяскоўцаў, жыхарамі навакольных населеных пунктаў. Скажам, Андрэй Сацюк ездзіў сюды на заняткі з Дзівіна за сем кіламетраў у школьныя гады. І цяпер, калі Андрэй жыве і працуе ў Брэсце, кожныя выхадныя з сябрамі спяшаецца на корт. А бізнесмен гаворыць, што ён ставіў задачу зрабіць для землякоў недаступнае даступным. І гэта яму, несумненна, удалося.

У свой летні адпачынак Іван Панасюк з сям'ёй абавязкова едзе на малую радзіму. Тут ён узвёў сельскую сядзібу з гасцявым домам, дзе могуць спыняцца спартсмены і аматары тэніса. Як і многія дзелавыя людзі, Іван Паўлавіч жыве на некалькі краін. Значную частку часу праводзіць, напрыклад, у Іспаніі, дзе мае інтарэсы бізнесу. У Новасібірску кіруе Беларускім культурна-асветніцкім цэнтрам «У імя святой Ефрасінні Полацкай». І, вядома, шмат часу праводзіць у роднай вёсцы, дзе заўсёды дапамагае добраўпарадкаваннем цэркваў і могілак, іншых сельскіх славутасцяў амаль 500-гадовага Лелікава.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ОАО «Красный Октябрь» извещает акционеров

о проведении 30 сентября 2019 года в 11.00 внеочередного общего собрания по адресу:
г. Витебск, проспект Генерала Людникова, 10

Повестка дня

1. О реорганизации ОАО «Красный Октябрь» путем присоединения Унитарного предприятия «Сан Марко» к ОАО «Красный Октябрь».
2. Об утверждении договора о присоединении Унитарного предприятия «Сан Марко» к ОАО «Красный Октябрь».
3. О возложении на директора ОАО «Красный Октябрь» обязанности письменно уведомить всех заинтересованных лиц о предстоящей реорганизации ОАО «Красный Октябрь».
4. Об утверждении цены выкупа акций ОАО «Красный Октябрь» по требованию акционеров.

С материалами по вопросам повестки дня акционеры могут ознакомиться в приемной директора Общества с 23 сентября по 29 сентября 2019 г. в рабочие дни (понедельник—пятница) с 13.30 до 17.00 и 30 сентября 2019 г. по месту проведения собрания.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет производиться в день проведения собрания с 10.00 до 10.45.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании, будет составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного на 16 сентября 2019 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

Справки по тел. 8-0212-52-55-70.

Директор ОАО «Красный Октябрь».

УНП 300003144

ОАО «Пинский винодельческий завод» сообщает о проведении 18.10.2019 г. первых электронных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества

1: ресторан «Озерный», целевое назначение – здание специализированное для общественного питания площадью 944,8 кв. м, расположенное по адресу: Витебская область, Браславский р-н, г. Браслав, ул. Советская, д. 115, на земельном участке с кадастровым № 220850100002000104 (площадь – 0,2310 га, право постоянного пользования), год постройки: 1968 г. Составные части и принадлежности: теплосети, кабельная линия, водопровод, канализация. Начальная цена предмета торгов без учета НДС: **117 000,00** бел. руб.

2: склад, целевое назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ площадью 193,0 кв. м, расположенное по адресу: Витебская область, Браславский р-н, г. Браслав, ул. Советская, д. 115, на земельном участке с кадастровым № 220850100002000104 (площадь – 0,2310 га, право постоянного пользования), год постройки: 1968 г. Начальная цена предмета торгов без учета НДС: **8 600,00** бел. руб.

Подробную информацию можно узнать на сайте bankrot.gov.by

УНП 200110728

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ
ОАО «ЗАВОД СБОРНОГО ЖЕЛЕЗОБЕТОНА № 1»!

30.08.2019 г. общим собранием акционеров ОАО «Завод сборного железобетона № 1» принято решение о реорганизации в форме выделения.

Согласно ст. 78 Закона «О хозяйственных обществах» акционеры, голосовавшие против принятия решения о реорганизации, а также акционеры, которые не были надлежащим образом извещены о проведении общего собрания акционеров, на котором было принято такое решение, имеют право требовать выкупа принадлежащих им акций.

Решением общего собрания акционеров от 30.08.2019 г. утверждена цена выкупа акций по требованию акционеров в размере 10 рублей за одну штуку.

Вы вправе направить письменное требование о выкупе акций в срок не позднее 29.10.2019 г.

Письменное требование о выкупе акций должно содержать ФИО (наименование), место жительства (место нахождения), контактный телефон, количество акций, которые требует выкупить акционер, подпись акционера, дату требования. Требование о выкупе акций направляется по адресу: 220070, г. Минск, ул. Передовая, 6. Дополнительная информация по тел. + 375 17 398 95 31.

УНП 100028892

УП «Белконфискат» обьявляет о проведении электронных торгов 27.09.2019 г. по продаже имущества, изъятого у Фомина Н. А.

Грузовой пикап Ford Ranger, 2014 г. в., начальной стоимостью 30 240 рублей.

На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 7790809. УНН 190431606

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 33 (475)

Паветра для пачатку

Выхаванцы Арт-цэнтра «Вулей» у Смілавічах прысвяцілі творы Манюшку

У іх адна радзіма. І яны таксама захопленыя творчасцю. Юныя мастакі з «Вулля», што існуе ў Смілавічах, прысвяцілі выстаўку свайму славутаму земляку, якую можна пабачыць у Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры. «Станіслаў Манюшка: музыка ў душы і вобразах» — гэта тэма важная не толькі ў юбілейны год кампазітара. Для дзетак з «Вулля» яна актуальная па азначэнні, бо блізкі ён для іх, свой, хоць і два стагоддзі прайшло. А мясціны тыя ж, паветра... І хоць няма ўжо ні сядзібы Манюшкаў, ні касцёла ў Смілавічах, дзе хрысцілі будучага кампазітара, застаўся парк і рэшткі палаца, дзе Станіслаў гасцяваў у дзіцінстве ў свайго дзядзькі, каб потым прыгадваць мінулыя дні ў оперы «Страшны двор». Смілавіцкі палац зараз рэстаўруецца, адзіны ў свеце музей кампазітара перабраўся з Убеля ў Смілавічы. Цяпер сюды можна хадзіць з экскурсіямі, слухаць музыку...

Навучэнцы Арт-цэнтра, якім кіруе Алена Карняенка, натхніліся такой экскурсіяй, вырашылі выказаць свае адчуванні ад творчасці і лёсу Манюшкі. Хтосьці стварыў партрэты самога кампазітара, хтосьці — краявіды яго радзімы. 17 выхаванцаў «Вулля» ўславілі земляка праз алейны жывапіс, графічныя тэхнікі, лямец. Агульнымі намаганнямі ўсіх удзельнікаў была ўвасоблена мастацкая прастора кампазітара.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Музыка

Спадчына — гэта гучыць

Балеты «Альпійская балада», «Маленькі прынц» і «Тыль Уленшпігель», опера «Майстар і Маргарыта», шэсць сімфоній, «Палеская сюіта» і «Беларуская рапсодыя», урачыстыя маршы, лірычныя інструментальныя п'есы, танцы і гумарэскі, а яшчэ песні для ўпадабаных гледачамі спектакляў і кінастужак «Беларусьфільма» — творчая спадчына народнага артыста СССР і БССР, кампазітара Яўгена Глебава насамрэч неабсяжная.

Нават без усякіх памятных дат творы Глебава гучаць, жывуць і застаюцца запатрабаванымі ў мноства выканаўцаў і шырокай публікі. Сёлета ж да 90-годдзя з дня нараджэння Яўгена Глебава і Года малой радзімы Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі зладзіла па ўсіх рэгіёнах вялікі гастрольна-канцэртны тур, які з 1 да 10 верасня праходзіць на адкрытых пляцоўках ва ўсіх абласных цэнтрах Беларусі. Памяць прафесара, які аддаў амаль 30 гадоў жыцця працы ў Акадэміі музыкі, ушаноўвае студэнцкі духавы аркестр пад кіраўніцтвам дырыжора, дэкана аркестравага факультэта Максіма Расохі.

У прыватнасці, учора канцэрт у фармаце опэн-эйру адбыўся на плошчы зорак у Магілёве, 8 верасня музыка Глебава будзе гучаць на Білецкім спуску ў Гомелі (пачатак канцэрта а 17-й гадзіне), а фінішнай кропкай творчага праекта стане плошча Свабоды ў Мінску (канцэрт у Верхнім горадзе пачнецца з 20.30).

Творчы праект «Музычная спадчына Радзімы», падтрыманы Міністэрствам культуры і ўсімі абласнымі і гарадскімі выканаўчымі камітэтамі, рэалізаваны за кошт сродкаў гранта спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Літаратура

НІЧОГА НЕ ЗАСТАЕЦЦА, ЯК СТАЦЬ ГЕНІЕМ...

Як вядома, на Дні беларускага пісьменства ў Слоніме былі аб'яўлены вынікі конкурсу «Нацыянальная літаратурная прэмія 2019». Пераможцам у намінацыі «Найлепшы твор прозы» стала кніга вядомага пісьменніка Алега Ждана (Пушкіна) «Геній». Алег Аляксеевіч — супрацоўнік нашага холдынга, рэдактар аддзела прозы часопіса «Нёман».
З пераможцам літаратурнага конкурсу гутарыць карэспандэнт «Звязды».


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Над чым вы зараз працуеце?

— Мне часта задаюць гэтае пытанне, як быццам пісьменнік на самай справе не можа пражыць ні дня без радка («ни дня без строчки»). Думаю, нават Пліній Старэйшы, які і нарадзіў гэтае крылатае выслоўе, дазваляў сабе расслабіцца перад новай работай. Я зараз таксама расслабіўся, бо толькі што закончыў новае апавяданне (ці невялікую аповесць) «Малітва» — пра пісьменніка. Летась я таксама напісаў апавяданне «Апошні сябра» — пра рэдактара вялікага літаратурнага часопіса, аб спецыфічных прафесійных і асабістых праблемах людзей гэтай прафесіі. Работа рэдактара цікавая, але часам вельмі няўдзячная, гэта я ведаю па сабе. У большасці выпадкаў аўтары прымаюць заўвагі і прапановы, а вось на днях я атрымаў пісьмо-абвінавачанне, падпісанае імем Ала Жураўская. Цікава, што з адразу заблакаваным зваротным адрасам. Не пажадала дзяўчына браць адказнасць за свае словы.

Але гэта выключэнне. Работа ў рэдактара зусім не простая: з кожным рукапісам патрэбна разабрацца. Гэта значыць, уважліва прачытаць, абдумаць, прыняць рашэнне...

У «Малітве» ж размова ідзе пра маладога літаратара, яго асабістае жыццё, творчасць і некаторыя болевыя кропкі нашага агульнага быцця.

— Што ў літаратурных планах на далейшае, Алег Аляксеевіч? Помніцца, вы планавалі напісаць вялікі твор пра сваю маці. Тэма наколькі ўдзячная, настолькі і складаная.

— Так, планаваў, дакладней — спадзяваўся, што змагу. Раман называўся б «Вера» — гэта і імя маці, і душэўны стан чалавека. Дваццаць гадоў мінула з таго часу, як маці пайшла, а я да гэтага часу адчуваю віну перад ёю. Напрыклад, за тое, што памерла без мяне. І не толькі. Хоць, думаю, я быў нядрэнным сынам. У думках вяду размову з ёю, віню сябе і апраўдваюся. Нават адчуваю патрэбу пакаяння. Перад кім? Хіба што перад яе магілай у Мсціславе.

Што датычыцца рамана... На дзясятай старонцы спыніўся, і — ні з месца. Нешта памылковае аказалася ў самой задумцы. Відаць, для рамана пакаянне не можа быць такой магутнай ідэяй.

— А ці геній герой аповесці, якая дала назву зборніку?

— Гэтае пытанне таксама часта мне задаюць. Але я не ведаю. І наогул размова ў аповесці не пра тое. Героя майго завуць Трыфан, Трышка, ён адзін на ўсёй зямлі, ні сябра, ні хоць бы прыяцеля, ні жанчыны. Нават маці не хоча ці не можа зразумець яго надзеі і імкненні. Яму нічога не застаецца, як у адзіноцтве верыць у сваю зорку. І нават скажу так: нічога не застаецца, як стаць геніем. Ён мастак, шукае свой шлях, не жадае прытрымлівацца нейкіх узораў. А неразуменне з боку адзінага блізкага чалавека — маці — успрымае як здраду.

Але вось апошнія думкі пра маці, якая памерла, апошні абзац аповесці: «...Напіша (ён напіша) што-небудзь сапраўды простае і харошае, толькі для таго, каб пацвердзіць яе веру: ён — Геній. І яшчэ дзеля таго, каб сустрэцца з ёю ў новым жыцці».

— Адукаваны чытач ведае вашы раманы «Князь Мсціслаўскі», «Гасударыня і епіскап», «Беларусцы», іншыя творы. Але не ўсе бачылі вашы апавяданні, надрукаваныя ў расійскіх часопісах. Я знайшоў іх у інтэрнэце і чытаў з велізарным задавальненнем. Як вы ставіцеся да таго, што іншым разам іх параўноўваюць з апавяданнямі Шукшына пра «чудзікаў».

— Паралель, канешне, не зусім карэктная, але ж я таксама чуў такое ад чытачоў. У любым горадзе, пасёлку, нават невялікай вёсцы заўсёды ёсць людзі, якія нечым выдзяляюцца. Нехта пачуццём гумару, нехта прыхільнасцю да моцных напояў, іншы — сваім лёсам. Ёсць такія персанажы і ў маім цыкле апавяданняў «Трэба цярпець». Жывуць яны і на роднай мне мсціслаўскай зямлі. Як я мог прайсці міма? Думаю, гэтак жа ставіўся да такіх людзей і Васіль Макаравіч Шукшын.

Але ёсць у гэтым цыкле апавяданні аб лёсах складаных, у прыватнасці апавяданне «Дом за ярам». Такія творы, магчыма, цяжка чытаць, але куды цяжэй жыць людзям з такім вось лёсам, як у майго героя, несправядліва абвінавачанага ў забойстве. Альбо гісторыя Мікіты Татарчонка (апавяданне «Пажар»), якога рэўнасць, дакладней, каханне прывялі да шэрагу злачынстваў.

Альбо герой апавядання «Трэба цярпець»: «...Была ў мяне ў вёсцы хатка, будка ў агародзе пад яблынькай, а ў будцы ложачак жалезны. Я на яго паклаў дошкі, а на дошкі саломкі. Захочацца — лягу, пасплю. А яшчэ быў у мяне сабачка, харошы такі. Куды не пайду — ён са мной. Адпачыць лягу — і ён са мной. Вуха мне паліжа, нос. Харошае было жыццё». Але жыццё крута змянілася, калі старому давялося пераехаць у горад. «Не, паміраць не хачу. Пакуль пажыву, цікава мне... Трэба цярпець».

Якія тут «чудзікі»? Так што супастаўленне з Шукшыным — павярхоўнае.

— Летась выйшла ваша дзіцячая кніжка «Вы яшчэ будзеце ганарыцца намі», якую вы падпісалі іншым імем — Алег Ждан-Пушкін. Чаму так? Чытачы ўжо прывыклі да літаратурнага прозвішча Ждан.

— Усё проста. Гэта ўласнае ад нараджэння імя ніколі не надакучыць чалавеку і часцей за ўсё падабаецца яму да апошніх дзён. А псеўданім — Ждан — вельмі нават можа надакучыць. Ждан-Пушкін — родавае прозвішча майго дзеда, святара Іаана Канстанцінавіча, частку якога ён страціў адразу пасля рэвалюцыі. Вось я і скарыстаўся ёю.

Гутарыў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.

Запрашальнік

МЕСЦА ДЛЯ ЭКСПЕРЫМЕНТАЎ...

6 верасня ў Мінску стартавала свята непаслушэнства і разбурэння рамак — міжнародны фестываль «ПЕРФОРМЕНСК», зладжаны групай мастакоў з Беларусі, Чэхіі, Расіі і Славакіі. Мэта ўжо другога сезона праекта — прадставіць беларускай публіцы работы маладых незалежных творцаў, якія працуюць у жанры жывога мастацтва (эксперыментальнага тэатра, перформанса, саўнд-арту), а ім самім — даць магчымасць абмяняцца ідэямі, натхніцца і стварыць прастору для далейшага супрацоўніцтва.

Фестываль разгарнуўся на некалькіх мінскіх пляцоўках: ва ўнутраных і знешніх прасторах музея-майстэрні Заіра Азгура і культурнага хаба ОК-16, дзе паралельна рэалізуюцца эксперыментальныя пастаноўкі і інсталяцыі. Асноўную праграму дапаўняюць мультымедыйныя спектаклі і перформансы малога фармату, выступленні гукавых мастакоў і музыкаў, а таксама адукацыйны блок.

Фармат «ПЕРФОРМЕНСКУ» — у адсутнасці фармату. Напрыклад, інтэрактыўная гульня ад Вялікага Цырка Няўдач дапускае ў пакой гледачоў толькі па адным, і кожнаму трэба прачытаць запіску са сваёй місіяй і самастойна разгадаць сакрэты тайнай суполкі. Лялечны аб'ектны монаспектакль «36 драматычных сітуацый» Ганны Раманавай, паказаны ў першы дзень фестывалю, камерны, ідзе ўсяго паўгадзіны і разлічаны максімум на 12 гледачоў. Затое праект «Фігуры», які сёння прадставіць у музеі-майстэрні Заіра Азгура хельсінкскае аб'яднанне кампазітараў і перформераў, уключае мноства дзеючых асоб і будзе доўжыцца ажно шэсць гадзін! Лекцыі, аўдыявізуальныя інсталяцыі, тэатралізаваная дзея пра апошні дзень на зямлі, нечаканыя лялечныя пастаноўкі і іншае мастацкае хуліганства, якое адбываецца перад гледачом проста тут і цяпер, завершацца вялікім і шумным канцэртам. Словам, калі душа просіць не класічнага сямейна-выхаднога праменаду на відовішчнае мерапрыемства, а чагосьці такога, каб разгарнуцца і згарнуцца назад, — вам менавіта сюды.

...І ТЭАТРАЛЬНАГА ШМАТГАЛОССЯ

З 8 да 15 верасня ў Брэсце 24-ы раз пройдзе адзін з найстарэйшых міжнародных тэатральных форумаў нашай краіны, фестываль «Белая вежа».

«Сымона-музыку» і «Новую зямлю», «Вішнёвы сад» і «Дзядзьку Ваню», «Жоўты пясочак» і «Ганну Франк», «Пышку» і «Вія», а таксама іншыя драматычныя, лялечныя, пластычныя пастаноўкі будуць даваць тэатры з 13 краін. Агулам у праграме 28 спектакляў, якія паказуць на пяці гарадскіх пляцоўках — на беларускай, рускай, украінскай, польскай, балгарскай, венгерскай, румынскай і грузінскай мовах.

Сёлета ў праграме два вулічныя спектаклі: у першы дзень фестывалю на плошчы Леніна свой «Карпацкі калейдаскоп» пакажа Львоўскі акадэмічны тэатр «Воскресиння», а ў апошні прадставіць сямейную пастаноўку «Каменны» тэатр «Сцэна калейдаскоп» (Кракаў, Польшча). Сярод іншых цікавінак «Белай вежы» — інклюзіўны аўдыятактыльны спектакль для дзяцей «Сябры Фядоры» (яго вязе Усходне-казахстанскі абласны драмтэатр), паэтычны монаспектакль Канстанціна Райкіна «Звычайныя словы» і балет «Стварэнне свету» ў пастаноўцы Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра класічнага балета Касаткінай і Васілёва. Дарэчы, гэты біблейскі сюжэт, аздоблены музыкай Андрэя Пятрова, з дня прэм'еры на працягу больш як 30 гадоў збіраў выключна аншлагі!

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Фестываль

ШТО БАЛІЦЬ

Пра тое гавораць сучасныя рэжысёры

«Плошча герояў».

Сканцэнтравацца на думках прапануе сёлета ТЭАРТ. 15 спектакляў, што склалі беларускую і міжнародную праграму, паводле арганізатараў уяўляюць з сябе ў пэўнай ступені канцэнтрат ідэй, разваг і эмоцый.

— Кожны спектакль сканцэнтраваны на нечым сваім, важным, — адзначае дырэктар Міжнароднага форуму тэатральнага мастацтва «ТЭАРТ» Анжаліка Крашэўская. Сапраўды, сучасны тэатр вельмі розны, але ён не страціў сваёй функцыі размаўляць з людзьмі пра нешта вельмі важнае, сур'ёзнае, балючае, тое, што хочацца абмеркаваць ці вырашаць на ўзроўні грамадства. — А мы хочам гаварыць пра тое, што нам баліць.

Таму ў асобны кірунак у рамках фестывалю сёлета вылучана праграма «Тэатр сацыяльных даследаванняў», якая дапаўняе шоўкейс Belarus Open. Наогул падбор спектакляў беларускай праграмы — гэта таксама даследаванне: грамадства шляхам тэатральных практык. Таму што ў тэатр мы ходзім не толькі дзеля адпачынку ці задавальнення, але і для таго, каб атрымаць штуршок для роздумаў, асэнсаванняў таго, як жывём і што можам удасканаліць у сабе ды навокал. І нават сам тэатр можа ўдасканальвацца, дзеля гэтага ўласна фестываль і задумваўся.

— Тэатр — гэта жывое мастацтва, ён можа мяняцца, — лічыць **Людміла ГРАМЫКА, куратар праграмы Belarus Open.** — За час існавання форуму ТЭАРТ і шоўкейса, які складаюць айчынныя пастаноўкі, беларускі тэатр змяніўся.

Варта прыгледзецца. Стартуе фестываль з 20 верасня менавіта з беларускай праграмы, куды ўвайшлі самыя адметныя спектаклі, якія выклікалі рэзананс за апошні час, дзе ёсць пошук і ідэя, актуальнасць. Дзе вядзецца размова пра нас, пра Беларусь. Гэта важна яшчэ і таму, што на фестываль запрашаюцца крытыкі з іншых краін, яны імкнуцца зразумець, што хвалюе людзей, якія жывуць у гэтай краіне, і якія працэсы адбываюцца ў нашым тэатры. Для гэтага адабралі восем пастановак: «Паляванне на сябе» Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі (рэжысёр Стас Жыркоў), пастаноўку Юрыя Дзівакова «Песня песняў» Цэнтра візуальных і выканальніцкіх мастацтваў ART Corporation, «Кандзід, альбо аптымізм» Магілёўскага абласнога тэатра лялек у пастаноўцы Ігара Казакова, танец-спектакль «Паветра» Вольгі Лабоўкінай і тэатра Karakuli, спектакль Мікалая Халезіна і Наталлі Каляды «Дом № 5», «Павятовы лекар» Гомельскага гарадскога маладзёжнага тэатра (рэжысёр Юрый Дзівакоў), спектакль Аляксандра Янушкевіча «Вартаўнікі Тадж-Махала» (Цэнтр візуальных і выканальніцкіх мастацтваў ART Corporation), «ГЭТАМЫ» Незалежнага тэатральнага праекта (рэжысёр Стас Жыркоў).

«Кандзід, альбо аптымізм».

Тэатр як сацыяльнае даследаванне і сродак уплыву на грамадства — кірунак не новы для тых, хто сочыць за тэатральным рухам. Але ўпершыню ён вылучаны ў асобную частку на міжнародным форуме. Рыхтуемся да знаёмства з Лабараторыяй сацыяльнага тэатра ECLAB Валянціны Мароз, якая пакажа спектакль «Родныя людзі?» на тэму хатняга гвалту. Беларуска-брытанскі праект HUNCHtheatre Уладзіміра Шчэрбаня ўдзельнічае з пастаноўкай «Левыя дысідэнты», створанай паводле сучасных айчынных аўтараў Алены Шпак і Андрэя Дзічэнкі. Брэсцкі тэатр «Крылы халопа» і Аксана Гайко прэзентуюць праект Brest Stories Guide, які прапануе размову на тэму антысемітызму, звяртаючыся да гістарычных падзей знішчэння Брэсцкага гета.

Тэатр як адлюстраванне чалавечай гісторыі хоча быць актуальным. Беларускі тэатр хоча вучыцца і асвойваць новыя плыні, падыходы і спосабы абудзіць нашу неабыякавасць да самога жыцця. І ёсць рэжысёры, для якіх гэта галоўная мэта творчасці. Менавіта на асобу рэжысёра звяртае ўвагу «Школа ТЭАРТ».

— Наша мэта рэалізуецца па двух кірунках: найперш трэба паглядзець, якія функцыі ў наш час выконвае рэжысёр, — тлумачыць **куратар гэтай часткі Аляксандр МАРЧАНКА.** — А далей трэба высветліць, якія магчымасці ёсць для пашырэння такіх функцый.

Вучыцца варта ў асоб. Напрыклад, такіх як Вацлаў Гавел, які вельмі паўплываў як аўтар і як чалавек з моцнай пасіянарнай энергіяй на абуджэнне народаў Усходняй Еўропы. У межах Школы адбудзецца паказ спектакля «Дуплет» і сустрэча з яго стваральнікам грузінскім рэжысёрам Канстанцінам Абашыдзэ. Яшчэ адна асоба — швейцарскі рэжысёр Дэні Майфер, адзін з кіраўнікоў тэатра La Comedie de Geneve. Пад яго кіраўніцтвам пройдзе рэжысёрская лабараторыя, падчас якой удзельнікі будуць думаць над стварэннем спектакля паводле Шэкспіра.

Свае асобы ў тэатры?.. Ёсць, і таксама гатовыя падзяліцца прафесійным досведам, але падчас дыскусій. Цікавыя думкі Дзмітрыя Багаслаўскага, Ігара Казакова, Аляксандра Янушкевіча? Вядомыя па рабоце ў айчынных рэпертуарных тэатрах, яны паспрабавалі сябе як вольныя мастакі і могуць казаць пра тое, як заставацца ў тэатральным працэсе ды рэалізаваць сябе ў мастацтве.

І пра мастацтва, яго сусветныя ўзоры. З імі звычайна знаёміць міжнародная праграма, усяго чатыры спектаклі. Гамераўская «Адысея» — вечная класіка, якую цікава глядзець у незвычайных інтэрпрэтацыях. Тэатр Талія з Германіі ў межах 25-годдзя Інстытута Гётэ ў Беларусі прадставіць адметны варыянт прачытання Гамера ад рэжысёра Анту Рамера Нуньеса. Класічны тэкст будзе прамаўляцца на мове, якой не існуе наогул. Вось і магчымаць пераканацца ў тым, што тэатральны твор, нават калі не ведаеш мовы артыстаў, усё адно кранае гледача. Тое ж самае павінна здарыцца падчас яшчэ аднаго прагляду — французскага харэаграфічнага спектакля «Піксель». Харэограф Мурада Мерзукі скіраваны на дыялог. Гэта дыялог не толькі паміж культурамі і народамі, гэта яшчэ дыялог паміж мастацтвам танца і візуальнымі 3D-выявамі.

У дыялог паміж эпохамі прапаноўвае ўключыцца Літоўскі нацыянальны драматычны тэатр у спектаклі «Плошча герояў», створаным паводле Томаса Бернхарда польскім рэжысёрам Крысціянам Люпам. Ці быў пераможаны фашызм падчас Нюрнбергскага працэсу? І ці не можа гэта пагражаць нашым сучаснікам, толькі ўжо на іншым узроўні і пад іншай маскай?..

У нечым сугучнай можа падасца пастаноўка «Сталінград» рэжысёра Рэзо Габрыадзэ. Яго ўласныя ўспаміны з далёкага мінулага ажываюць праз работу акцёраў з марыянеткамі. Тэатр, які скарае свет, — тэатр шчыры.

Канцэнтрат шчырасці — вось чаго варта чакаць сёлета падчас ТЭАРТу.

Ларыса ЦІМОШЫК.



Выстаўка

Адкрыты космас

«Вайна сусветаў» Аляксандра Кішчанкі дэманструецца шырокай публіцы

Мастак Аляксандр Кішчанка мысліў маштабна. Рассоўваў гарызонты, выходзіў за рамкі. Нават за магчымасці, якія былі вызначаны для пэўных твораў мастацтва. Таму і быў сапраўдны манументаліст — калі рабіў, дык без абмежаванняў. Гэта дало штуршок арганізатарам выстаўкі, што працуе ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, па-новаму асэнсаваць творчасць народнага мастака, які пакінуў свет напрыканцы XX стагоддзя.

Але ж гэтае самае стагоддзе яго натхняла і давала падставы для разваг, прычым на ўзроўні грамадства. Чаго варты толькі яго «Габелен стагоддзя», які вельмі актыўна абмяркоўваўся, і не толькі ў творчым асяродку. Таму што адлюстраваныя на ім людзі, пра якіх найбольш гаварылі ў XX стагоддзі (і неабавязкова станоўча — пра Сталіна, напрыклад), падзеі, калі закладвалася чалавечая гісторыя, — ад Ноева каўчэга і далей, да Ісуса Хрыста і прыходу магчымага Антыхрыста. Таму, што вобразы, створаныя мастакамі, часам сапраўды з`яўляюцца ў жыцці, іх прадчуванні спраўджваюцца, а творы бываюць прарочымі, хочацца думаць, што Кішчанка сумяшчаў несумяшчальнае (як падавалася) не проста так. Магчыма, ён бачыў шырока — не толькі зямное. Таму назва «Касмічны пілігрым» пасуе выстаўцы народнага мастака Беларусі Аляксандра Кішчанкі.

Сваё касмічнае мысленне ён рэалізаваў у Беларусі. Нарадзіўся ў Расіі, вучыўся ва Украіне, але асноўную частку творчага жыцця і галоўныя творчыя этапы ён пражыў у Беларусі. Спрыяў развіццю беларускага мастацтва — манументальнага, габеленавага. Але тут і цяпер мы гаворым пра жывапісца.

Творы розных тэм і жанраў апошніх дваццаці гадоў жыцця майстра сышліся ў экспазіцыі, хоць і знаходзяцца цяпер у розных зборах: у Нацыянальным мастацкім музеі, сям'і мастака, у прыватных калекцыях. Партрэты, нацюрморты, кампазіцыі, у якіх закранаецца сацыяльная праблематыка, распавядаюць пра суіснаванне ідэальнага Чалавека і Сусвету.

«У экспазіцыю ўключаны як вядомыя хрэстаматыйныя палотны майстра, так і творы, што ніколі раней не дэманстраваліся шырокай публіцы. Сярод такіх, напрыклад, карціна «Вайна сусветаў» — апошняя работа майстра, — адзначае **куратар праекта Наталля СЯЛІЦКАЯ, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела сучаснага беларускага мастацтва Нацыянальнага мастацкага музея.** — У канцы 1970-х гадоў канчаткова сфарміравалася яго ўласная пластычная сістэма «касмічнай» пабудовы прасторы, якую ён сам назваў «усяленскім рэалізмам», заснаваным на ўзаемадзеянні двух пачаткаў: сімволікі, уласцівай прыёмам манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, і рэалістычнай пераканаўчасці станковага твора».

А яшчэ падаецца, што космас можна насіць у сабе. І неабавязкова быць філосафам па жыцці, бо драбніцы Сусвету раскіданыя па зямлі. У асобных сюжэтах і фрагментах, у людзях і іх душах, у памкненнях ісці далей і бачыць больш. І калі гэта ўсё ў нейкі момант перасягае асабістыя жаданні, то можна востра адчуваць актуальныя праблемы сваёй эпохі. Кішчанка маштабны не толькі па памерах твораў, ён маштабны па глыбіні ўспрымання і па пластычнасці ўвасаблення творчых ідэй, калі рэчаіснасць і жывапісны рэалізм можа захапляць. А ці ўсё мы ведаем (бачылі) на зямлі?

Ларыса ЦІМОШЫК.

ТАМАТЫ ДЛЯ ДУШЫ

Ад гладыёлусаў да памідораў

У распараджэнні Надзеі Іванаўны невялікая плантацыя ў гектар-два, а звычайны прысядзібны ўчастак у прыватнай забудове раённага цэнтра. На пятнаццаці сотках размяшчаюцца дом з гаспадарчымі пабудовамі і невялікі па вясковых мерках агарод, дзе значную частку займае бульба — куды ж без яе? У дзвюх васьміметровых цяпліцах, а таксама на некалькіх градках у адкрытым грунце і растуць таматы.

— Памідоры я вырошчваю даўно, ужо гадоў 30, але спачатку гэта не было такім захапленнем. Садзіла як і многія, звычайныя чырвоныя — для сябе. А захаплялася тады гладыёлусамі: у мяне іх было сартоў 200. Вазілася я з імі, напэўна, гадоў 20. А потым кветкі захварэлі.

Пасля Надзея Іванаўна пачала разводзіць лілеі і ружы, яны і цяпер растуць побач з домам. І аднойчы, шэсць гадоў таму, убачыла ў часопісе незвычайныя сарты таматаў:

— Я спачатку падумала, што толькі на поўдні такія можна вырасціць, а не ў нашых умовах. Але так мне яны спадабаліся, што захацела пачытаць пра іх у інтэрнэце. Адразу трапіўся каталог калекцыянера з Сібіры. Ну і вырашыла:

калі растуць у Сібіры, то і ў нас змогуць. І адразу заказала 100 сартоў! Памятаю, яшчэ моцна засмучалася, што нічога ўжо гэтым летам не ўдасца пасадзіць, бо быў канец жніўня.

Затое на наступны год у Надзеі Куц на градках красавала сотня экзатычных сартоў. За пяць гадоў яе калекцыя разраслася. Ужо летась у ёй налічвалася 400 сартоў і 500 раслін, сёлета сартоў ужо 600, а раслін — не менш за 700!

— У канцы высадкі я іх ужо перастала лічыць, таму, магчыма, і больш. Гэта і сапраўды вельмі шмат, — прызнаецца жанчына. — Але так атрымалася: я абмянялася з іншымі калекцыянерамі, набыла новыя сарты і ўсе ранейшыя вырашыла пасадзіць, каб сёлета сабраць паболей насення і менш давялося садзіць налета. Але ўжо разумею, што так не атрымаецца, — смяецца яна.

Кожны сорт у цяпліцах пазначаны біркай з назвай, а на памідоры ў адкрытым грунце маецца нават свая схема, занатаваная ў спецыяльным сшытку. Надзея Іванаўна кажа, што нічога складанага ў вырошчванні «экзотаў» няма:

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

усё гэтак жа, як і са звычайнымі сартамі.

— Яны нічым не адрозніваюцца — могуць расці нават у адкрытым грунце, калі лета не халоднае. Сёлетняе было дажджлівае, але ж выраслі! Любыя памідоры не любяць дажджлівае надвор'е. Ад лішняй вільгаці расліны заўчасна пачынаюць хварэць. Вось летась да сярэдзіны верасня на градках была прыгажосць, а сёлета выгляд ужо не той, хоць ураджай усё роўна атрымаўся добры.

Клопаты з лютага да лістапада

Дарэчы, жанчына прызнаецца, што ў яе няма мэты вырасціць вялізны ўраджай. Памідоры для яе — больш чым проста плады.

— Калі трэба вырасціць максімальны ўраджай, тады варта пасадзіць гібрыды. Мае ж сарты могуць даць менш пладоў, але бяруць сваім асаблівым знешнім выглядам і смакам. Я вырошчваю таматы для душы.

Увагі да сябе гэтыя расліны патрабуюць дзевяць месяцаў у год. І ўвесь вольны час Надзея Іванаўна аддае ім. Памідорныя клопаты пачынаюцца з лютага, калі на падаконніках з'яўляюцца першыя слоікі з расадай. Дарэчы, толькі сяўба насення займае ледзь не месяц — заканчваецца ў сярэдзіне сакавіка. Пакуль дасяваецца апошняе, першае ўжо выросла і просіць перасадкі ў большую пасудзіну. Высадка ж расады ў цяпліцы і адкрыты грунт займае ўвогуле больш за месяц: стартуе з сярэдзіны красавіка і заканчваецца ў канцы мая. А клімат паўночнага рэгіёна нярэдка ўносіць свае карэктывы.

— «Першапраходцаў» я сёлета высадзіла 14 красавіка, укрыла іх дадаткова спанбондам на ўсялякі выпадак. Пашчасціла, што вясна была цёплая, таму нічога страшнага не адбылося. У цяпліцах скончыла высаджваць у пачатку мая. А з 10 мая садзіла ў адкрыты грунт. Напярэдадні здарыўся такі лівень, што ўсё ў агародзе плавала. Але адну градку 10 мая я ў гумавых ботах усё ж пасадзіла.

Мульчыраванне, падвязка і абрэзка, паліў, збор насення і ўраджаю па сартах — кожная аперацыя па доглядзе вымагае вялікай працы і часу. А адпачыць можна з лістапада, калі глеба перакапана і цяпліцы падрыхтаваны да наступнага года.

— У мяне толькі тры месяцы ў год — лістапад, снежань і студзень — «беспамідорныя», — жартуе Надзея Іванаўна.

Парад сартавых «ягад»

Жанчына ўжо 38 гадоў працуе ў Бешанковіцкай раённай бібліятэцы, цяпер яна загадвае аддзелам абслугоўвання і інфармацыі. І вядомасць не толькі ў аматарскіх колах, але і сярод звычайных агароднікаў да яе прыйшла дзякуючы выстаўцы «Парад таматаў», якую яна ладзіць у чытальнай зале. Сёлета прайшла ўжо пятая па ліку. Надзеі Куц удалося заахвоціць і сваіх калег-бібліятэкараў: на прысядзібных участках яны таксама вырошчваюць экзатычныя таматы, а потым дэманструюць ураджай і дзеляцца вопытам. Прычым штогод у 2-3 сартоў плады вырастаюць вагой больш за кілаграм. Сёлетні год стаў выключэннем: самым вялікім быў 970-грамовы тамат сорту «Загадка прыроды».

А паглядзець на цуда-ўраджай прыязджаюць людзі нават з іншых гарадоў. Сёлета, напрыклад, на выстаўцы ў Бешанковічах пабывалі ўдзельнікі віцебскага клуба кветкаводаў-аматараў, перад якімі Надзея Іванаўна гэтай зімой выступіла з лекцыяй.

— Пачыналі мы ў 2015 годзе: усе выставілі тое, што вырасцілі. Было тады ўсяго каля 40 сартоў, — успамінае жанчына. — А сёлета — 237, яны занялі дзевяць сталоў. Сарты, якія былі раней, я не выстаўляла, іх ужо бачылі наведвальнікі. Старалася прадставіць навінкі. Усіх наведвальнікаў папярэджваю, каб запісвалі назвы сартоў, якія спадабаліся, — каб потым пры жаданні набыць.

Сама Надзея Куц можа доўга расказваць пра экзатычныя назвы:

— Гэта «Лета кахання» — прыгожыя «паласацікі», — гартае яна фотаздымкі на маніторы. — А вось «Сяржант Пэпер», дарэчы, сорт названы ў гонар знакамітага альбома групы «Бітлз» «Аркестр клуба адзінокіх сэрцаў сяржанта Пэпера». Такія цікавыя сарты выведзены ў ЗША. Там існуе кірунак селекцыі аматарскіх сартоў і асобна выводзяцца сарты для фермерства. Аматарскія менш ураджайныя і горш захоўваюцца. Яны ў гэтым плане такія далікатныя: тыдзень паляжаць — і псуюцца. Вось «Чырвоны вугаль», гэта «Сібірская пантэра», побач «Цёмны тыгр» — усе з антацыянам (пігмент, які абумоўлівае чырвоную, сінюю, фіялетавую афарбоўку пладоў).

«Фларэнційская прыгажуня», «Шахеразада», «Чорнае сэрца Брэда» — рамантычныя назвы ўпрыгожваюць і пакецікі з насеннем, акуратна раскладзеныя па каробачках. Многія аматары набываюць яго ў Надзеі Іванаўны. Пакупнікі праз сацсеткі звяртаюцца з усёй Беларусі: і з Брэсцкай, і з Гродзенскай, і з Гомельскай абласцей.

— Цяпер сартавыя таматы папулярныя. Па-першае, яны вельмі смачныя. Па-другое, многім надакучылі маленькія чырвоныя памідоры і хочацца паспрабаваць вырасціць штосьці іншае.

Для пашырэння ўласнай калекцыі сарты Надзея Куц заказвае і набывае ў Расіі. У кожным пакеціку ўсяго пяць зярнятак. Але ўзыходзяць звычайна ўсе.

— Я саджу кожны сорт толькі па адным зярнятку. Можна расліну зламаць выпадкова, вось тады — бяда. Прыходзіцца ўкараняць — яна вырасце і дасць ураджай, але пазней.

Жанчына сціпла кажа, што ніякага асаблівага вопыту ў развядзенні не мае і працягвае вучыцца на сваіх памылках. У вольны час вывучае публікацыі ў інтэрнэце, дзе дзеляцца досведам людзі з агранамічнай адукацыяй.

«Шкада зрываць плады»

Ураджай, хоць і не з'яўляецца мэтай, але штогод складае некалькі сотняў кілаграмаў, з'есці якія аднаму, вядома, не пад сілу. У сям'і жанчыны — адна дачка Алена, якая жыве ў Докшыцах і да маці наведваецца толькі ў выхадныя. Раней памідоры Надзея Іванаўна прадавала на рынку. Але прызнаецца, што часу на гэта заўсёды шкада. Ды і пакупнікі самі прыходзяць дадому. Астатняе ідзе на загатоўкі. Толькі соку сёлета выціснута 30 літраў — справа заняла цэлы тыдзень. Закручвае жанчына і салаты, кетчупы, соусы, аджыку.

Захапленне не столькі прыносіць прыбытак, колькі патрабуе вялікай працы:

— Калі палічыць працоўныя выдаткі, напэўна, і не трэба было б гэтым займацца, — кажа Надзея Іванаўна. — Гэта ж кожны дзень: у пяць я прыходжу дадому, бутэрброд зрабіла — і хутчэй на агарод. Працую, пакуль не сцямнее. Але па-іншаму я ўжо не магу. Раніцай устала, пайшла да памідораў, паглядзець, як там справы, — і добры настрой адразу з'яўляецца. Любуюся імі і калі зацвілі, і калі з кветачкі першы яблычак завязаўся. Нават калі толькі ўзышлі — глядзіш на малышоў і радуешся, як і пасля, калі вырастаюць прыгажуні. Сёлета адна цяпліца была занятая цалкам экзатычнымі памідорамі, я не магла там знімаць ураджай — мне шкада зрываць плады.

Алена КРАВЕЦ,
г. п. Бешанковічы.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«ПЛАТЕЖНОЕ КОЛЬЦО»

Настоящие правила проведения Рекламной игры «Платежное кольцо» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением «О проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь», утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения на территории Республики Беларусь Рекламной игры «Платежное кольцо» (далее – Рекламная игра, Игра).

1. Общие положения
1.1. Организатор Рекламной игры.
Организатором Рекламной игры является ООО «Дачмедиа». Адрес: 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 7А-73, УНП 192208517, зарегистрированное Минским горисполкомом Республики Беларусь решением от 5 февраля 2014 года, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192208517.

1.2. Заинтересованное лицо: закрытое акционерное общество «Минский транзитный банк», 220007, г. Минск, ул. Толстого, 10, УНП 100394906.

1.3. Наименование Рекламной игры: «Платежное кольцо».

1.4. Территория проведения Рекламной игры: Рекламная игра «Платежное кольцо» проводится на всей территории Республики Беларусь.
Розыгрыши призов проводятся в офисе ООО «Дачмедиа» по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 7А-73.

1.5. Срок начала и окончания Рекламной игры, включая срок выдачи выигрышей и публикации результатов проведения Рекламной игры: с 09.09.2019 г. по 19.11.2019 г.

1.6. Период, в течение которого можно стать участником Рекламной игры: с 9 сентября по 2019 г. по 13 октября 2019 г. включительно.

1.7. Состав комиссии по проведению Рекламной игры (далее – Комиссия):
● Председатель комиссии: Борисовец Екатерина Дмитриевна, специалист по работе с клиентами ООО «Дачмедиа»

● Члены комиссии:
● Бушило Екатерина Валерьевна, главный специалист Управления маркетинга ЗАО «МТБанк»;
● Назарук Наталья Евгеньевна, ведущий специалист по рекламе ООО «Дачмедиа»;
● Чернышевич Светлана Андреевна, ведущий специалист по рекламе ООО «Дачмедиа»;
● Гладкая Мария Дмитриевна, специалист по работе с клиентами ООО «Дачмедиа».

1.8. Цель Рекламной игры:
Рекламная игра «Платежное кольцо» проводится в целях стимулирования физических лиц к заключению договоров безотзывного банковского вклада (депозита) в белорусских рублях в ЗАО «МТБанк» (далее – «Депозит»).

1.9. При использовании в Правилах термин «банковский вклад (депозит)» используется в значении, определенном статьей 179 Банковского кодекса Республики Беларусь: банковский вклад (депозит) – денежные средства в белорусских рублях или иностранной валюте, размещаемые физическими и юридическими лицами в банке или небанковской кредитно-финансовой организации в целях хранения и получения дохода на срок, либо до востребования, либо до наступления (ненаступления) определенного в заключенном договоре обстоятельства (события). Согласно статье 182 Банковского кодекса Республики Беларусь договоры безотзывного банковского вклада (депозита) — договоры, не предусматривающие возврат вклада (депозита) до истечения срока возврата вклада (депозита) или наступления (ненаступления) определенного в заключенном договоре обстоятельства (события).

1.10. Порядок участия в Рекламной игре:
1.10.1. Участниками Игры могут быть физические лица, достигшие 18 лет — граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь.

1.10.2. Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства. Члены комиссии не могут быть участниками Рекламной игры.

1.10.3. Для участия в Игре необходимо в период с 00.00 09.09.2019 года по 23.59 13.10.2019 года включительно:

1.10.3.1. Заключить договор безотзывного банковского вклада (депозита) на любой срок на сумму от 1 000 (одной тысячи) белорусских рублей в любом отделении ЗАО «МТБанк» либо посредством системы дистанционного банковского обслуживания «Интернет-Банк» в личном кабинете пользователя на сайте https://mybank.by.

1.10.3.2. Зарегистрироваться для участия в Рекламной игре на сайте Рекламной игры ring.mtbank.by (далее – Сайт), ознакомиться с настоящими Правилами и с Порядком оказания ЗАО «МТБанк» услуг, входящих в состав Призового фонда, указать фамилию, имя, отчество (полностью), личный номер паспорта, контактный телефон, e-mail и нажать кнопку «Участвовать». Совершая указанные выше действия (регистрируясь на Сайте), участник дает согласие на участие в Рекламной игре; согласие на использование Организатором его персональных данных и контактных данных, в том числе для уведомления его в случае выигрыша, а также подтверждает свое ознакомление и согласие с настоящими Правилами и с порядком оказания ЗАО «МТБанк» услуг, входящих в состав Призового фонда.

1.10.4. Каждому участнику Рекламной игры присваивается игровой код по дате и времени регистрации на Сайте.

1.10.5. За заключенный договор безотзывного банковского вклада (депозита), соответствующий критериям участия, указанным в п.1.10.3 Правил, Участнику предоставляется одна возможность на выигрыш приза в ходе Рекламной игры. В случае заключения нескольких договоров безотзывного банковского вклада (депозита), соответствующих критериям участия, указанным п.1.10.3 Правил, в Рекламной игре принимает участие исключительно первый зарегистрированный на Сайте (и подтвержденный согласием на участие в Рекламной игре) договор безотзывного банковского вклада (депозита).

1.10.6. К моменту розыгрыша данные об Участниках Рекламной игры формируются Организатором в список для розыгрыша с указанием ФИО Участников, контактного телефона, e-mail, а также даты и времени регистрации Участников на Сайте и даты заключения договора безотзывного банковского вклада (депозита). Организатор Рекламной игры присваивает каждому Участнику Игровой код, начиная с 00001 и выше, по дате и времени регистрации Участника на Сайте. Если дата и время регистрации на Сайте разных Участников Рекламной игры совпадают, то более ранний номер присваивается тому Участнику, фамилия которого следует в алфавитном порядке раньше.

2. Состав, размер призового фонда и источники его формирования:
2.1. Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет денежных средств и имущества Заинтересованного лица в размере 22 988,50 белорусского рубля.

2.2. Призовой фонд Рекламной игры включает в себя призы, перечисленные ниже в Таблице № 1 (Состав Призового Фонда):

Таблица № 1. Состав Призового Фонда

№	Наименование призов	Количество	Стоимость с НДС за ед., бел. руб.	Итого с НДС, бел. руб.
1	Оказание ЗАО «МТБанк» услуг по тарифному плану «Платежное кольцо» следующего содержания Состав услуг Тарифного плана: 1) открытие Счета в белорусских рублях; 2) предоставление в пользование платежного инструмента (банковской платежной карточки Visa Platinum Instant Issue) в виде NFC-кольца со встроенным бесконтактным чип-модулем сроком действия 4 года; 3) предоставление в пользование до 2 дополнительных карточек Visa Platinum сроком действия 4 года; 4) установление процентного дохода по остаткам денежных средств на Счете; 5) подключение к СДБО «Интернет Банк»; 6) рассылка выписок по Счету на адрес электронной почты; 7) СМС-оповещение об операциях с использованием банковской платежной карточки; 8) сервисы, предоставляемые международной платежной системой Visa International по банковской платежной карточке Visa Platinum (состав сервисов может изменяться международной платежной системой Visa International в одностороннем порядке)	50	400	20000
	Денежная часть приза (далее — Услуга согласно тарифному плану «Платежное кольцо»)		59,77	2988,50

3. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения Победителей:

3.1. Розыгрыши Призового фонда проводятся открыто в присутствии Комиссии в офисе Организатора по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 7А-73, в следующие даты:
19.09.2019, в 15.00;
26.09.2019, в 15.00;
03.10.2019, в 15.00;
10.10.2019, в 15.00;
17.10.2019, в 15.00.

3.2. Порядок проведения розыгрышей и порядок определения победителей, участвующих в розыгрыше Призов:

3.2.1. Все завернутые бумажки так, чтобы их нельзя было прочесть, с написанными Игровыми кодами Участников, участвующих в Текущем розыгрыше, засыпаются в лототрон и перемешиваются, объявляется разыгрываемый приз, затем один из членов комиссии достает из лототрона 10 (десять) Игровых кодов – так определяются все Победители.

3.2.2. Игровые коды Участников Текущего розыгрыша Призов не участвуют в последующих Розыгрышах. Все Игровые коды Участников после розыгрыша изымаются в присутствии Комиссии, опечатываются и хранятся у Организатора.

3.2.3. Результат каждого Розыгрыша в обязательном порядке фиксируется в протоколе розыгрышей, подписанном присутствующими на заседании членами комиссии.

3.3 Даты и время розыгрышей, Игровые коды, принимающие участие в розыгрышах, и разыгрываемые призы перечислены в Таблице № 2:

Таблица № 2

Порядковый номер розыгрыша	Дата и время розыгрыша	Игровые коды, принимающие участие в розыгрыше, сформированные на основании даты регистрации участника на Сайте в период с 09.09.2019 г. по 13.10.2019 г.:	Призовой фонд розыгрыша	
			Наименование призов	Количество, шт.
1	19.09.2019, 15.00	с 00.00 9 сентября до 23.59 15 сентября 2019 года	Услуга согласно тарифному плану «Платежное кольцо»	10
2	26.09.2019, 15.00	с 00.00 16 сентября до 23.59 22 сентября 2019 года	Услуги согласно тарифному плану «Платежное кольцо»	10
3	03.10.2019, 15.00	с 00.00 23 сентября до 23.59 29 сентября 2019 года	Услуга согласно тарифному плану «Платежное кольцо»	10
4	10.10.2019, 15.00	с 00.00 30 сентября по 23.59 6 октября 2019 года	Услуга согласно тарифному плану «Платежное кольцо»	10
5	17.10.2019, 15.00	с 00.00 7 октября по 23.59 13 октября 2019 года	Услуга согласно тарифному плану «Платежное кольцо»	10

4. Порядок уведомления победителей о результатах Рекламной игры, порядок получения выигрыша.
4.1. Победители Розыгрышей извещаются Организатором сообщением, отправляемым на адрес электронной почты, указанной при регистрации на Сайте, и звонком на указанный Участником при регистрации на Сайте номер телефона в течение 7 (семи) календарных дней после проведения каждого розыгрыша Призов. Организатор также оставляет за собой право дополнительно уведомлять победителей любым удобным ему способом: посредством СМС-рассылки на указанные при регистрации на Сайте номера мобильных телефонов.
4.2. Порядок получения Призов:
получение Приза производится путем заключения Договора между ЗАО «МТБанк» и Победителем на условиях тарифного плана «Платежное кольцо».
Победители, проживающие в городе Минске или не проживающие, но имеющие возможность получить приз в городе Минске, должны явиться за получением Приза в отделение ЗАО «МТБанк» по адресу: г. Минск, улица Толстого, 10, с 9.00 до 17.30 в период со дня, следующего за днем проведения розыгрыша, и по 12.11.2019 года (включительно), кроме субботы, воскресенья и государственных праздничных дней.
При себе необходимо иметь паспорт (или вид на жительство).
Для иногородних победителей, не имеющих возможность явиться в г. Минск для получения Приза, возможно получение Приза в срок до 19.11.2019 года (включительно) в одном из следующих отделений ЗАО «МТБанк» в соответствии с режимом работы отделения, указанным на сайте www.mtbank.by, при предварительном информировании об этом Организатора не позднее чем за 7 (семь) дней до планируемой даты получения Приза по телефону +375 17 221 00 20:
РКЦ № 19 г. Брест, пр-т Машерова, 53
РКЦ № 22 г. Могилев, ул. Комсомольская, 10/14
РКЦ № 30 г. Жодино, пр-т Ленина, 15Б/6
РКЦ № 32 г. Гродно, ул. Антонова, 31
РКЦ № 38 г. Бобруйск, ул. Комсомольская, 47
РКЦ № 40 г. Молодечно, ул. Волынца, 12Д
РКЦ № 45 г. Гомель, ул. Советская 97, корп. 2
РКЦ № 55 г. Гомель, пр-т Ленина, 26/73
РКЦ № 57 г. Лида, ул. Советская, 29
РКЦ № 58 г. Витебск, пр-т Черняховского, 6
РКЦ № 62 г. Светлогорск, ул. Калинина, 6, ТЦ «Березки»
РКЦ № 64 г. Барановичи, ул. Ленина, 21/3 около магазина «1000 мелочей»
РКЦ № 66 г. Солигорск, ул. Ленина, 36

Организатор при выдаче Призов Победителям Рекламной игры признается налоговым агентом и несет ответственность за соблюдение действующего налогового законодательства Республики Беларусь. В соответствии с главой 18 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор при вручении Приза удерживает у Победителя из денежной части приза и перечисляет в бюджет подоходный налог в установленном порядке.
4.3. Организатор не оплачивает Участникам Рекламной игры расходы, связанные с проездом к месту получения Призов.
4.4. Победитель при получении Приза письменно подтверждает факт его получения, заполняет все необходимые документы, связанные с получением Приза.
4.5. Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента Призов не осуществляется.

5. Прочие условия:
5.1. Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.
5.2. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участники соглашаются с тем, что их имена, отчества, фамилии, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победители Рекламной игры дают свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Рекламной игры, без выплаты им какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Заинтересованному лицу ЗАО «МТБанк».

5.3. Организатор не несет ответственности за:
5.3.1. Ошибки, допущенные Участниками Рекламной игры, и за достоверность сведений и личных данных, указанных на Сайте.
5.3.2. Невозможность связаться с Участником в случае недостоверности (некорректности) информации, предоставленной Участником.
5.3.3. Невыполнение (несвоевременное выполнение) Участниками обязанностей, связанных с участием в Рекламной игре и получением Призов.
5.3.4. Неознакомление Участников с настоящими Правилами и условиями участия в Рекламной игре, а равно их неознакомление с результатами проведения Рекламной игры, неознакомление Участников с порядком оказания ЗАО «МТБанк» услуг, входящих в состав Призового фонда.
5.3.5. Неполучение (несвоевременное получение) от Участников документов, необходимых для получения призов (паспорта или вида на жительство).
5.4. Правила Рекламной игры публикуются в газете «Звязда» до начала ее проведения.
5.5. Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» в срок по 25.10.2019 г. включительно.
5.6. Телефон для справок по вопросам проведения Рекламной игры: +375 17 221 00 20 работает в будние дни с 10.00 до 18.00. Звонок платный, в соответствии с тарифами операторов, которыми пользуется Участник.
5.7. Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
5.8. Все возможные претензии Участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Победителей, 7А-73, почтовый индекс 220004.

Свидетельство № 3631 о государственной регистрации рекламной игры, зарегестрированной 29 августа 2019, выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Вандроўка па Брэсце

Да 1000-годдзя горада



ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 1. ..., Берестье, Берасце, Бярэсце, Брэст-Літоўск. Адна са старажытных назваў Брэста, які ўпершыню ўпамінаецца 1000 гадоў таму ў «Аповесці мінулых гадоў». **5.** Ілья ... . Прозвішча легендарнага савецкага палярнага лётчыка, Героя Савецкага Саюза, ураджэнца г. Брэста. Яго імя ўвекавечана ў назве вуліцы горада. **9.** Дзяцінец альбо ... . Найбольш умацаваная частка старажытнага Брэста, якая размяшчалася на мысе, утвораным правым берагам р. Заходні Буг і левым берагам рукава р. Мухавец. **12.** Манетны ... . Прадпрыемства па вырабе медных манет (барацінак), якое дзейнічала ў Брэсце ў другой палове XVII стагоддзя; у гэты жа час у горадзе адчыняліся школы, дзейнічаў тэатр. **13.** Мікалай Радзівіл ... . Мянушка брэсцкага старасты, які заснаваў першую на Беларусі друкарню, дзе ў 1563 годзе была выдадзена Радзівілаўская (Брэсцкая) біблія — выдатны літаратурны помнік. **17.** «... ад розуму». Камедыя ў вершах вядомага рускага паэта, драматурга, дыпламата А. Грыбаедава, літаратурная дзейнасць якога пачалася ў час, калі ён праходзіў у Брэст-Літоўску ваенную службу. **18.** Эмблема горада; ... з выявай сярэбранага лука са стралой г. Брест атрымаў разам з магдэбургскім правам, якое дараваў гораду вялікі князь ВКЛ і кароль Польшчы Ягайла ў 1390 годзе. **20.** Член царкоўнай абшчыны, які вёў аскетычны лад жыцця; ім быў пісьменнік-публіцыст, царкоўны дзеяч XVII стагоддзя, ураджэнец г. Брэста Афанасій Філіповіч, якому ў Брэсце ўсталяваны помнік. **21.** Хто прыняў бой, той сапраўдны ... *(прык.)*. У гады Вялікай Айчыннай вайны пры абароне Брэсцкай крэпасці вызначыліся маёр П. Гаўрылаў і лейтэнант А. Кіжаватаў, якім за мужнасць і адвагу было прысвоена званне Герояў Савецкага Саюза, іхнімі імёнамі былі названы ў Брэсце вуліцы. Ганаровае званне крэпасць-герой было нададзена Брэсцкай крэпасці 8 мая 1965 года. **23.** Аўтаматычны механізм для замыкання і размыкання электрычнага ланцуга. **27.** Складальнік летапісу. **29.** У старажытнасці баявы вайсковы сцяг. У Грунвальдскай бітве 1410 года прымала ўдзел і ... г. Брэста. **30.** Сутыкненне, злучэнне.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1. Невялікі вершаваны твор на гістарычную ці легендарную тэму. **2.** Рад пакаленняў. **3.** Тое, што і тэзіс. **4.** Старажытнае дэкаратыўнае пісьмо. **6.** Прысады, дарожка ў парку. **7.** Рост, развіццё. **8.** Дзмітрый ... . Прозвішча Героя Савецкага Саюза, генерал-лейтэнанта, прафесара, які ў 1911—1914 гадах прымаў удзел у рэканструкцыі Брэсцкай крэпасці; у час вайны быў закатаваны ў нямецкім канцлагеры Маўтгаўзен. **10.** Помнік старажытнай пісьменасці, які паведамляе ўсеагульную гісторыю па біблейскіх легендах. **11.** Вертыкальны выступ у сцяне для павышэння яе ўстойлівасці. **14.** Добрая ... лепш багацця *(прык.)*. **15.** Менахем ... . Прозвішча былога прэм'ер-міністра Ізраіля, лаўрэата Нобелеўскай прэміі міру, ураджэнца г. Брэста. **16.** У старажытнасці спявак — музыкант, акрабат; ... ладзілі свае выступленні і на кірмашах старажытнага Брэста. **19.** У грэчаскай міфалогіі бог агню, майстэрскі каваль; такую ж назву носіць буйное Брэсцкае прадпрыемства па вытворчасці газавай апаратуры. **22.** Распаўсюджвальнік чыіх-небудзь ідэй *(перан.)*. **24.** Цэнтр якой-небудзь дзейнасці *(перан.)*. **25.** «Белая ... ». Міжнародны тэатральны фестываль, які штогод праводзіцца ў г. Брэсце. **26.** Брэсцкі ... . Мірны дагавор паміж Савецкай Расіяй, Германіяй і іншымі краінамі, які быў падпісаны ў Брэст-Літоўску 3 сакавіка 1918 года. **28.** «Жыццё і жыта розныя ... словы, // А выстралілі з корня аднаго». З верша «Жыта» У. Калесніка, літаратуразнаўца, пісьменніка, прафесара, які доўгі час узначальваў Брэсцкае літаратурнае аб'яднанне і выхаваў шмат пісьменнікаў Брэстчыны.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,
г. Дзяржынск.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: 1. Верасце. 5. Мазурык. 9. Дзяравінец. 12. Дзор. 13. Чорнае. 17. Горад. 18. Гераб. 20. Манах. 21. Герой. 23. Рэчка. 27. Летапісец. 29. Харугва. 30. Кантакт. **Па вертыкалі:** 1. Багацце. 2. Рад. 3. Тэза. 4. Вязь. 6. Алея. 7. Рух. 8. Карбышаў. 10. Хранограф. 11. Контрфорс. 14. Сцяна. 15. Бегін. 16. Скамарох. 19. Гефест. 22. Рупар. 24. Нерв. 25. Верка. 26. Мір. 28. Дуб.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.27	19.47	13.20
Віцебск —	6.15	19.38	13.23
Магілёў —	6.18	19.37	13.19
Гомель —	6.16	19.31	13.15
Гродна —	6.43	20.01	13.18
Брэст —	6.46	20.00	13.14

Месяц

Першая квадра
6 верасня.
Месяц у сузор'і
Казярога.

Імяніны

Пр. *Варфаламея, Міны, Уладзіміра.*
К. *Рэгіны, Марка, Рычарда, Сцяпана.*

Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

7 ВЕРАСНЯ

У краіне

1919 год — нарадзіўся (вёска Пушкары Віцебскага раёна) Алесь Асіпенка (Аляксандр Харытонавіч Асіпенка), беларускі пісьменнік, заслужаны работнік культуры Беларусі. У 1955 годзе скончыў Мінскі педінстытут. У 1952—1953 гадах рэдактар газеты «Чырвоная змена», з 1966-га — галоўны рэдактар часопіса «Маладосць», з 1972-га — сцэнарнага аддзела кінастудыі «Беларусьфільм», у 1976—1980 гадах узначальваў газету «Літаратура і мастацтва». Асноўныя тэмы твораў пісьменніка — гераізм беларускага народа ў барацьбе з фашызмам, актуальныя сацыяльныя і маральна-этычныя праблемы. Аўтар раманаў «Вогненны азімут», «Непрыкаяны маладзік», «Святыя грэшнікі». Аўтар зборнікаў апавяданняў і аповесцяў «Лёд растае», «Дарога ў даль», «Крокі», «Парогі», «Канец бабінага лета», «Два дні і дзве ночы», «Пяцёра адважных» і іншых. Аўтар сцэнарыяў мастацкіх фільмаў «Пяцёра адважных», «Канец бабінага лета», «Трывогі першых птушак». Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступені, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны» і медалямі. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, Літаратурнай прэміі імя І. Мележа. Памёр у 1994 годзе.

1990 год — да 500-годдзя з дня нараджэння беларускага першадрукара, слаўнага палачаніна Ф. Скарыны адкрыты Полацкі музей беларускага кнігадрукавання, філіял Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Размяшчаецца ў будынку былой брацкай школы Полацкага Багаяўленскага манастыра — помніка архітэктуры XVIII стагоддзя. Музей знаёміць наведвальнікаў з гісторыяй стварэння і развіцця пісьменства ў Беларусі, жыццём беларускіх асветнікаў і першадрукароў.

У свеце

1859 год — быў запушчаны самы вялікі ў свеце гадзіннік на вежы Біг-Бэн лонданскага Вестмінстэрскага палаца — адна з галоўных славутасцяў Лондана і Вялікабрытаніі.

1870 год — нарадзіўся Аляксандр Іванавіч Купрын, рускі пісьменнік. Сябраваў з М. Горкім, супрацоўнічаў у яго выдавецтве «Веды». У 1919 годзе эміграваў у Францыю, з 1937-га жыў на радзіме. Пасля паездкі на Палессе ў 1897 годзе напісаў цыкл апавяданняў «У лясной глушы», «На глушцоў», аповесць «Алеся». Аўтар аповесцяў «Яма», «Вадкае сонца», цыкла нарысаў «Кіеўскія тыпы», рамана «Юнкеры». Многія творы пісьменніка экранізаваны. Сярод іх: «Алеся», «Паядынак» і іншыя. Памёр у 1938 годзе.

УСМІХНЕМСЯ

Людзі на электрасамакатах выглядаюць так, быццам не зусім правільна разумеюць фразу «трэба больш рухацца».

— Хадзем нап'ёмся.

— Мне няма чаго надзець.

— У цябе ж шмат адзення!

— Я ў гэтым адзенні ўжо напівалася.

Ён доўга спрабаваў сябе ў розных прафесіях і нарэшце знайшоў тое, што даўно шукаў.

Багатую старую жанчыну.

Адэскі панадворак. Хлопчык на балконе грае на скрыпцы, а пудзель з суседняй кватэры яму падвывае ў такт. Нарэшце бацька не вытрымлівае:

— Моня, спыні гэта неадкладна! Ты можаш іграць тое, што пудзель не ведае?

Самае сумнае ў першы дзень пасля адпачынку — гэта снедаць не півам.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3123. Нумар падпісаны ў 19.30 6 верасня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12